Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

№ 80 (28696)

27 КРАСАВІКА 2018 г.

ПЯТНІЦА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

9-24 стар.

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

+TV ПРАГРАМА

«Раны» на карце

Вундэркінды і Георгій Калдун

Каму належаць гаражы-міражы?

«ПРЫГАЖОСЦІ ШМАТ НЕ БЫВАЕ!»

ЦЫТАТА ДНЯ

Юрый СЯНЬКО, старшыня Дзяржаўнага мытнага камітэта Рэспублікі Беларусь:

«У першым квартале 2018 года беларускімі мытнікамі выпушчана каля 16,5 % экспартных дэкларацый на працягу 1-2 хвілін. Сёння аўтаматычны выпуск тавараў замацаваны па ініцыятыве беларускай мытні ў Мытным кодэксе Еўразійскага эканамічнага саюза».

ISSN 1990 - 763X

...Кажа жыхарка Бабруйска Людміла ШЫЛОВІЧ — кветкавод-аматарка. Не першы год на невялікай клумбе пад вокнамі дзевяціпавярховага дома, у якім яна жыве, садзіць мноства самых розных відаў кветак. Не толькі для сябе — для суседзяў па пад'ездзе і ўсіх жыхароў шматпавярховіка стварае кветкавую прыгажосць. Болей за сотню найменняў кветак расце з вясны да восені на яе клумбе. Напрыклад, адных касачоў дзесяць найменнаў, руж і таго болей — ажно дваццаць пяць кустоў, півоняў — восем сартоў, дзясятак лекавых раслін...

— Яшчэ з зімы на балконе я прарошчваю насенне, а потым, як сонейка добра прагрэе глебу, перасаджваю расліны ў грунт, — кажа Людміла Шыловіч. — На захапленне кветкамі мяне натхніў ветэран вайны Барыс Мікалаевіч Музалеўскі, які жыве ў нашым доме і кожную вясну працуе над упарадкаваннем двара.

Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.

■ Дыскусія

ЯК ПАЛЕПШЫЦЬ ЖЫЦЦЁ ЛЮДЗЕЙ З АСАБЛІВАСЦЯМІ?

Удасканаліць законы і перастаць бачыць у інваліднасці толькі медыцынскую праблему...

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Апошнім часам шмат гаворыцца пра праблемы людзей з інваліднасцю. І зразумела чаму — бо яны ёсць. Хоць мы не стаім на месцы і дзяржава стараецца абараняць правы гэтых людзей. Сёння нельга сказаць, што нашы законы ў чымсьці супярэчаць нормам Канвенцыі ААН аб правах інвалідаў. Але, напрыклад, канвенцыя ўстанаўлівае забарону ўсякай дыскрымінацыі па прыкмеце інваліднасці. Але што лічыць дыскрымінацыяй? У розных людзей на конт гэтага можа быць рознае меркаванне. Таму мы не пераадолеем яе, калі не канкрэтызуем, што ж гэта такое і якія ў яе прыкметы, і не прапішам гэта дакладна і зразумела ў законе. І гэта не адзінае пытанне, якое чакае ўдакладнення.

Таму дэпутаты Пастаяннай камісіі па працы і сацыяльных пытаннях Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі пачынаюць работу па падрыхтоўцы законапраекта **«Аб змяненні законаў па пытаннях сацыяльнай абароны інвалідаў»**. Нядаўна камісія правяла выязное пасяджэнне, на якое былі запрошаны прадстаўнікі самых розных міністэрстваў і ведамстваў, а таксама грамадскіх аб'яднанняў людзей з інваліднасцю. Яго мэтай было прагаварыць асноўныя болевыя пункты і пачуць канкрэтныя прапановы ўсіх зацікаўленых удзельнікаў.

Пытанняў для абмеркавання аказалася шмат. Напрыклад, на думку **намесніка міністра працы і сацыяльнай абароны Аляксандра РУМАКА**, нам трэба адрэгуляваць пытанні надання людзям з інваліднасцю права на ўдзел у культурным і спартыўным жыцці грамадства і выразна прапісаць гэта ў заканадаўстве.

СТАР. 4

КАРОТКА

Працоўныя пенсіі ў Беларусі з 1 мая ў выніку пераразліку павялічацца ў сярэднім на 5,4 %. Гэта прадугледжана Указам № 142 «Аб павышэнні пенсій», які Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка падпісаў 26 красавіка.

У Егіпце плануюць штрафаваць гандляроў, якія занадта назойліва прапануюць свой тавар на тэрыторыі турыстычных аб'ектаў або музеяў. Адзначаецца, што штраф складзе 10 000 егіпецкіх фунтаў (звыш $560). Дадзены штраф у два разы перавышае памер сярэдняга месячнага заробку ў Егіпце. Ініцыятыва закліканая надаць егіпецкаму турызму «цывілізаваны імідж».

Юныя беларускія хакеісты саступілі камандзе Фінляндыі з лікам 2:5 (0:3, 1:2, 1:0) у плэй-оф чэмпіянату свету (U-18) у Расіі і завяршылі выступленне на турніры. Падапечныя Паўла Перапехіна выйшлі ў васьмёрку наймацнейшых каманд сусветнага форуму, гэта найбольш высокі вынік з ЧС-2002 года (5-е месца).

Школьнік у навушніках трапіў пад цягнік у Добрушскім раёне. Інцыдэнт адбыўся 25 красавіка каля станцыі Насовічы. З рознымі траўмамі непаўналетні жыхар Добрушскага раёна 2002 г. н. быў дастаўлены ў рэанімацыю.

ПАРАДАК — ПАКАЗЧЫК ДЫСЦЫПЛІНЫ І БЯСПЕКІ

Прадпрыемствы нясуць сур'ёзную адказнасць за захаванасць сельгастэхнікі

Аб гэтым Прэзідэнт заявіў учора, калі ў Палацы Незалежнасці абмяркоўваліся пытанні захоўвання і падрыхтоўкі сельскагаспадарчай тэхнікі да палявых работ, а таксама проціпажарная сітуацыя ў краіне на аб'ектах масавага наведвання грамадзян.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што на дадзены момант інфармацыя, якая да яго даходзіць, сведчыць аб тым, што належная работа па забеспячэнні захаванасці і ўкамплектаванасці машынна-трактарнага парка да гэтага часу не наладжана.

«Калі б гэтую сельгастэхніку — трактары, аўтамабілі, прычапную тэхніку і іншую — куплялі калектыўныя прадпрыемствы і іншыя занятыя ў сельскай гаспадарцы за свой кроўны рубель, калі ласка — можаце мяне крытыкаваць, казаць, што гэта не мая справа і няма чаго ў гэта ўмешвацца, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Але калі сельскагаспадарчыя прадпрыемствы ўсіх формаў уласнасці ідуць з працягнутай рукой у бюджэт, просяць субсідыі, датацыі, крэдыты, прытым крэдыты льготныя, і за кошт гэтага набываюць сельскагаспадарчую тэхніку і праводзяць іншыя мерапрыемствы ў сельскай гаспадарцы, тады будзьце ласкавы дастаць і пакласці на стол сваю актыўнасць па захаванасці гэтай тэхнікі».

Прэзідэнт нагадаў аб сваім даручэнні да 15 красавіка разабрацца з фактамі безгаспадарчасці самым жорсткім чынам, аж да завядзення крымінальных спраў: «Я хачу, каб не забывалі, што парадак на мехдварах — гэта паказчык жалезнай дысцыпліны, захавання тэхналогій, бяспекі работнікаў. А ў цэлым — гэта найважнейшы элемент эканомікі сяла».

Кіраўнік дзяржавы звярнуў таксама ўвагу на проціпажарную сітуацыю, якая ў краіне складваецца не самым лепшым чынам. Толькі з пачатку года адбылося больш за 160 пажараў у ведамасным фондзе краіны, у жылым — 1600.

«Яшчэ раз паўтараю: не дай бог нам атрымаць нешта блізкае да Кемерава», — падкрэсліў беларускі лідар.

Прычына — расхлябанасць і безгаспадарчасць

Міністр па надзвычайных сітуацыях Уладзімір ВАШЧАНКА адзначыў, што пажары ў жылым фондзе, на прадпрыемствах, у арганізацыях адбываюцца не з-за адсутнасці дарагіх інжынерна-тэхнічных рашэнняў, а з-за безадказнага стаўлення грамадзян да ўласнай бяспекі, невыканання кіраўнікамі прадпрыемстваў, службовымі асобамі сваіх абавязкаў па забеспячэнні здаровых і бяспечных умоў працы.

Уладзімір Вашчанка падкрэсліў, што да пажараў прыводзіць захламленасць тэрыторый смеццем, няправільная эксплуатацыя абсталявання, нясвоечасовая ачыстка працоўных месцаў ад гаручых матэрыялаў, курэнне ў неабсталяваных месцах, выкарыстанне адкрытага агню, невыкананне проціпажарных патрабаванняў пры правядзенні зварачных работ і эксплуатацыі электраабсталявання, наяўнасць крыніц узгарання. «Вялікі рэзерв мы бачым у навучанні і прывядзенні проціпажарных інструктажоў. Часта гэта робіцца фармальна. Работнікі прадпрыемстваў не валодаюць элементарнымі навыкамі дзеянняў у выпадку ўзнікнення надзвычайнай сітуацыі», — сказаў Уладзімір Вашчанка.

Галоўная прычына такога становішча спраў — расхлябанасць і безгаспадарчасць. На сённяшні дзень вядзецца работа па ліквідацыі недахопаў, прыняты шэраг жорсткіх мер, падкрэсліў міністр па надзвычайных сітуацыях.

Ад праверак — да ўздзеяння

Па выніках нарады **міністр унутраных спраў Ігар ШУНЕВІЧ** падкрэсліў, што час угаворaў і разваг пры праверцы сельскагаспадарчых прадпрыемстваў прайшоў, праваахоўнікі маюць намер прымяняць эфектыўныя меры ўздзеяння на гаспадаркі і арганізацыі.

«Калі казаць адкрыта, то пахваліцца няма чым ні нам з пункту гледжання праверкі, ні тым, каго мы правяралі, паколькі ў нейкай ступені парадак наведзены, але гэтага відавочна недастаткова для таго, каб сказаць, што ў нас усё ў парадку, усе шасцярэнькі круцяцца так, як трэба. Масла ў гэтыя шасцярэнькі мы падальём у найбліжэйшы час, і яны будуць круціцца — гэта дакладна», — сказаў міністр.

Па выніках нарады ён паведаміў журналістам, што кіраўнік дзяржавы паставіў канкрэтную задачу — перайсці ад курыравання некаторых пытанняў і праверачных мерапрыемстваў да эфектыўнага ўздзеяння на гэтыя працэсы з выкарыстаннем усіх прававых, адміністрацыйных, сілавых і іншых механізмаў, якія ёсць у распараджэнні Міністэрства ўнутраных спраў, Генеральнай пракуратуры, усяго сілавога блока.

Для ўздзеяння на негатыўныя працэсы будзе распрацавана сістэма мер. Міністр адзначыў, што праблема застарэлая, аднак механізм дакладна прымусяць працаваць больш эфектыўна. Якія парушэнні выяўлены ў сельгасарганізацыях? Асноўны пералік — гэта халатнасць, безадказнае стаўленне да матэрыяльна-тэхнічных сродкаў, загубленая тэхніка, парушэнне тэхналогій, а яшчэ гэта стаўленне да людзей, якія працуюць на зямлі.

Часу мала, а працы шмат

Міністр сельскай гаспадаркі і харчавання Леанід ЗАЯЦ пасля завяршэння нарады адзначыў, што сяўбу ранніх яравых збожжавых культур у краіне плануецца завяршыць да першага мая, усіх астатніх — не пазней за дзявятага мая. На яго думку, неабходна максімальна эфектыўна выкарыстоўваць кожны дзень для таго, каб забяспечыць тэхналагічную закладку ўраджаю.

Асобна стаіць пытанне захаванасці матэрыяльна-тэхнічнай уласнасці прадпрыемстваў, паколькі ў гэтым яшчэ трэба будзе навесці парадак. Леанід Заяц заявіў, што з абуральнымі фактамі безгаспадарчасці мірыцца ні ў якім разе нельга, трэба брацца за ўсе хібы і недахопы, як, напрыклад, крадзеж паліва, бо іх ліквідацыя дасць нам эканомію матэрыяльна-тэхнічных рэсурсаў.

Таксама міністр расказаў, што ў 2018—2019 гадах істотны рост можа паказаць і жывёлагадоўля.

* * *

На сустрэчы беларускі лідар таксама выказаўся з нагоды 32-й гадавіны трагедыі на Чарнобыльскай АЭС. «Як звычайна, я сёння адлятаю на поўдзень краіны ў раёны, пацярпелыя ў выніку катастрофы, — адзначыў ён. — Перш за ўсё хачу паглядзець, як ідзе пасяўная кампанія і як выконваюцца мае даручэнні па дадатковым уключэнні ў абарот сельскагаспадарчых зямель».

У сувязі з гэтым кіраўнік дзяржавы папярэдзіў губернатараў і міністра сельскай гаспадаркі і харчавання, каб была паказана рэальная сітуацыя з выкананнем дадзеных даручэнняў.

Асобна кіраўнік дзяржавы адзначыў, што будаўніцтва новага моста цераз Прыпяць (ход якога ён можа наведаць — адпаведнае даручэнне дадзена) павінна быць завершана да сёмага лістапада. «Але папярэджваю: усе работы павінны быць закончаны ў гэтым годзе. Ніякіх работ на 2019 год, — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.

■ Каб помнілі

МУЖНАСЦЬ У БРОНЗЕ

Помнік энергетыкам Савецкага Саюза — ліквідатарам наступстваў аварыі на ЧАЭС адкрыты ў Хойніках

Фота БелТА.

На ім — тры спецыялісты, якія цягнуць кабель, каб падаць электрычнасць у абясточаныя раёны, якія накрыла радыеактыўнае воблака. Сюжэт 1986 года ў бронзе ўвасобіў беларускі скульптар Валерый Кандраценка.

Кампазіцыя знаходзіцца ў гарадскім скверы, дзе два гады таму быў спачатку ўстаноўлены мемарыяльны гранітны камень. Тады прадпрыемства «Гомельэнерга» абвясціла пра збор сродкаў для стварэння скульптуры. На заклік адгукнуліся больш як два дзясяткі арганізацый і прадпрыемстваў галіны. Свой унёсак зрабілі не толькі энергетыкі Беларусі, але і іх расійскія калегі.

— Трагедыя магла б мець куды большыя маштабы, калі б не самаадданая мужнасць усіх тых, хто з гонарам выканаў свой прафесійны і грамадзянскі абавязак, — адзначыў падчас адкрыцця **міністр энергетыкі Беларусі Уладзімір ПАТУПЧЫК.**

Дарэчы, у ліквідацыі наступстваў чарнобыльскай катастрофы бралі ўдзел каля 2,5 тысячы работнікаў беларускай энергасістэмы.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

Праз 32 гады

25 красавіка ўпершыню прайшоў брыфінг для дыпламатычнага корпуса, прымеркаваны да гадавіны аварыі на ЧАЭС. На ім яшчэ раз успомнілі пра гэту трагедыю XX стагоддзя, ліквідатараў і жыхароў тэрыторый, якія пацярпелі ад яе. А таксама пра важнасць узаемадапамогі ўсяго свету.

Чаму менавіта сёлета вырашылі правесці гэты брыфінг, адказаў **намеснік міністра замежных спраў Андрэй ДАПКЮНАС**: «Мы робім гэта з некалькіх прычын. Па-першае, аб'ём і працягласць увагі Беларусі да трагедыі Чарнобыля вызначаецца не толькі ўвагай міжнароднай супольнасці. Яна вызначаецца перыядам паўраспаду радыеактыўных рэчываў, якія забрудзілі тэрыторыю краіны, якія закранулі і змянілі жыццё мільёнаў людзей. Таму нам з гэтым жыць, нам з гэтым змагацца, нам і ствараць сваю будучыню, у тым ліку пацярпелых раёнаў. Мы ўдзячныя міжнародным установам за дапамогу, якая аказваецца».

Акрамя таго, як адзначыў спадар Дапкюнас, у нас ёсць унікальны вопыт у пераадоленні наступстваў аварыі на АЭС і мы абавязаны ім дзяліцца са светам. Яшчэ адзін фактар, які гаворыць пра тое, што гэта тэма дагэтуль актуальная, — непараўнальная хваля чалавечага водгуку на бяду бліжняга, незвычайнае суперажыванне людзей з розных куткоў планеты, якія тады адчулі беларусы. «Мы адчуваем сваю адказнасць, абавязак пра гэта памятаць, за гэта дзякаваць», — растлумачыў намеснік міністра.

На сёння ў краіне налічваецца 71 907 удзельнікаў ліквідацыі наступстваў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС. Сістэма радыелагічнага кантролю ўключае больш за 800 арганізацый, якія штогод аналізуюць амаль 1,5 млн проб на ўтрыманне цэзію-137. Дакладныя лічбы падаў **намеснік міністра па надзвычайных сітуацыях Генадзь ЛАСУТА**.

У рамках праектаў міжнароднай дапамогі за перыяд з 1990 года на мінімізацыю наступстваў катастрофы на ЧАЭС у Беларусі прыцягнута больш за $84 млн. І гэта лічба не ўключае гуманітарную дапамогу з боку грамадскіх арганізацый і прыватных асоб, а таксама сродкі, патрачаныя донарамі на аздараўленне за мяжой дзяцей, якія пражывалі на пацярпелых тэрыторыях. Намеснік міністра запрасіў дыпламатаў зрабіць выезд на поўдзень краіны і бліжэй пазнаёміцца з пацярпелымі тэрыторыі ў Брагінскім, Хойніцкім, Нараўлянскім раёнах, а таксама з Палескім дзяржаўным радыяцыйна-экалагічным запаведнікам.

Надзея АНІСОВІЧ

БЕЗ БЮРАКРАТЫЗМУ І ПА СПРАВАХ

Традыцыйныя прамыя тэлефонныя лініі адбудуцца ў суботу, 28 красавіка, у Мінгарвыканкаме і аблвыканкамах. На сувязь з 9.00 да 12.00 выйдуць:

намеснік старшыні БРЭСЦКАГА аблвыканкама Андрэй Анатолевіч КЛЕЦ. Тэл. 8 016 221 31 21;

старшыня ВІЦЕБСКАГА аблвыканкама Мікалай Мікалаевіч ШАРСНЁЎ. Тэл. 8 021 222 22 22;

першы намеснік старшыні ГОМЕЛЬСКАГА аблвыканкама Аляксандр Віктаравіч МІКАЛУЦКІ. Тэл. 8 023 233 12 37;

старшыня ГРОДЗЕНСКАГА аблвыканкама Уладзімір Васілевіч КРАЎЦОЎ. Тэл. 8 015 273 56 44;

намеснік старшыні МАГІЛЁЎСКАГА аблвыканкама Віктар Уладзіміравіч НЕКРАШЭВІЧ. Тэл. 8 022 250 18 69;

кіраўнік спраў МІНСКАГА аблвыканкама Уладзімір Аляксандравіч ГУРЫНОВІЧ. Тэл. 8 017 500 41 60;

намеснік старшыні МІНСКАГА гарвыканкама Ігар Віктаравіч ЮРКЕВІЧ. Тэл. 8 017 222 44 44.

■ Пасланне Прэзідэнта — 2018

«ГЭТА НАС ХВАЛЮЕ»

Віктар ЛІСКОВІЧ, намеснік старшыні Гродзенскага аблвыканкама:

— Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка ў сваім Пасланні ўзняў найактуальнейшую тэму — таго, што трэба сканцэнтравацца на мірных ініцыятывах, накіраваных на кансалідацыю народа. Менавіта такая пазіцыя дазваляе развівацца дзяржаве і садзейнічае дабрабыту яе грамадзян. У ідэале такі ўнутраны кірунак павінен быць у кожнага жыхара, работніка, спецыяліста любой сферы дзейнасці.

Асабліва гэта датычыцца сродкаў масавай інфармацыі. Яны могуць у значнай ступені садзейнічаць кансалідацыі, а не раз'ядноўваць грамадства.

Кіраўнік дзяржавы раскрытыкаваў паводзіны некаторых СМІ, у тым ліку расійскіх, за тое, што яны «падкідваюць палены ў вогнішча». Абсалютна згодны, што ў нашай краіне дзейнасць такіх падпальшчыкаў нельга дапускаць.

Тое, што інфармацыя можа быць сапраўднай зброяй, зразумела ўсім. Уплыў СМІ, інтэрнэт-рэсурсаў нельга недаацэньваць. Ці гэта не повад паклапаціцца пра неакрэплыя розумы дзяцей, падлеткаў, якія могуць прыняць за чыстую манету любую правакацыю?

Думаю, што сёння, як ніколі, важна несці адказнасць за свае словы, якія выказваюцца публічна. Трэба падумаць, узважыць іх наступствы для сваіх землякоў і наогул усіх грамадзян. У гэтым кірунку працуюць і прапановы па змяненні ў закон аб СМІ, законапраект якіх прыняты дэпутатамі ў першым чытанні.

Дзмітрый ХАРЫТОНЧЫК, старшыня Магілёўскага абласнога Савета дэпутатаў:

— Як былому намесніку старшыні Магілёўскага аблвыканкама па пытаннях развіцця прамысловасці, мне вельмі імпанавалі выразныя даручэнні кіраўніка дзяржавы па развіцці фінансавага рынку і IT-сферы краіны. Зараз увесь свет рухаецца з улікам глабалізацыі, камп'ютарызацыі, аб'яднання інфармацыйнай прасторы. Мы бачым, што ў нас ёсць добрыя вынікі ў развіцці інфармацыйных тэхналогій, назапашаны неабходны вопыт, ёсць база, практыка, веды. Галоўнае — ні ў якім разе не спыняцца, а, наадварот, бегчы ў гэтым кірунку як мага хутчэй.

Мне таксама спадабалася, што Прэзідэнт закрануў тэму балансу адказнасці дзяржавы і грамадства. Нашым грамадзянам трэба пастаянна і метадычна нагадваць пра тое, што прайшлі часы, калі дзяржава забяспечвала насельніцтва ўсім неабходным, у тым ліку лямпачкамі ў пад'ездах. Дзяржава павінна захоўваць сацыяльную накіраванасць, але трэба, каб была выразная дыферэнцыяцыя таго, каму і як дапамагаць. Жыхарам краіны неабходна разумець сваю адказнасць перад дзяржавай і кожнага перад кожным.

Цалкам згодны з пазіцыяй Прэзідэнта і ў адносінах да будучыні сельсаветаў. На пытанне аб мэтазгоднасці тэрытарыяльнай рэарганізацыі, аб'яднання сельсаветаў, магчымасці іх ліквідацыі ён заўважыў, што гэта рабіць пакуль заўчасна. Гэта сапраўды так. На сённяшні дзень гэтыя органы выконваюць вельмі шмат функцый. І калі нават разглядаць у будучыні нейкую іх аптымізацыю, скарачэнне, то ўжо зараз трэба працаваць над змяненнем функцыянальнага прызначэння сельсаветаў. Каб потым людзям не прыйшлося па кожную даведку ездзіць у цэнтр. Мы павінны вельмі ўважліва вывучаць, як гэта паўплывае на жыццё людзей, і пачуць меркаванне жыхароў канкрэтных тэрыторый.

Наталля ЯКУБІЦКАЯ, старшыня Мінскага абласнога Савета дэпутатаў:

— У сваім Пасланні да беларускага народа і Нацыянальнага сходу Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь падняў пласт пытанняў, якія датычацца знешняй і ўнутранай палітыкі, эканомікі. У Мінскай вобласці па рэалізацыі задач, агучаных у Пасланні, асабліва ўвага ўдзяляецца росту заработнай платы, стварэнню ўмоў для прыцягнення інвестыцый, а таксама пытанням працоўнай занятасці.

Абноўлены склады пастаянна дзеючых камісій па каардынацыі работы па садзейнічанні занятасці насельніцтва. Ва ўсіх рэгіёнах Міншчыны іх узначальваюць старшыні раённых Саветаў дэпутатаў.

Рашэннем Мінскага абласнога Савета дэпутатаў прынятая праграма сацыяльна-эканамічнага развіцця Мінскай вобласці на перыяд да 2020 года. Дакумент накіраваны на аднаўленне ўстойлівага эканамічнага росту цэнтральнага рэгіёна і набліжэнне ўзроўню якасці жыцця насельніцтва краіны ў цэлым да развітых дзяржаў свету.

Я цалкам падзяляю пазіцыю кіраўніка дзяржавы і асабліва падтрымліваю меркаванне, што нашай асноўнай мэтай застаецца будаўніцтва дзяржавы для народа. Пасланне стане кіраўніцтвам да дзеяння не толькі для ўлад, але і для грамадзян.

Маргарыта УШКЕВІЧ, Нэлі ЗІГУЛЯ, Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

НА СЁННЯ ЗАПЛАНАВАНА СУСТРЭЧА ЛІДАРАЎ ПАЎДНЁВАЙ КАРЭІ І КНДР

Лідар Паўночнай Карэі Кім Чэн Ын і прэзідэнт Рэспублікі Карэя Мун Чжэ Ін сустрэнуцца ў пятніцу, 27 красавіка, каля дэмаркацыйнай лініі, перадае Reuters. Чакаецца, што па выніках саміту кіраўнікі краін падпішуць сумесны дакумент.

Прэзідэнт Паўднёвай Карэі Мун Чжэ Ін і лідар КНДР Кім Чэн Ын разам пасадзяць дрэва, якое стане сімвалам прымірэння і наладжвання адносін паміж дзвюма дзяржавамі. Пра гэта паведаміў журналістам кіраўнік адміністрацыі прэзідэнта Рэспублікі Карэя Ім Чжон Сок, піша ТАСС.

«Каля поўдня два лідары разам пасадзяць дрэва ў знак імкнення да міру і росквіту», — падкрэсліў ён. На памятнай шыльдзе, якая будзе ўстаноўлена побач з дрэвам, будуць выгравіраваны словы «Тут пусцілі карані Мір і Росквіт».

МАКРОН ЗАКЛІКАЎ ЕЎРОПУ І ЗША БУДАВАЦЬ СВЕТАПАРАДАК XXI СТАГОДДЗЯ

Выступаючы з прамовай у кангрэсе ЗША, прэзідэнт Францыі раскрытыкаваў нацыяналізм і гандлёвыя войны. Ён заклікаў ЗША сумесна з Еўропай змагацца супраць тэрарызму, забруджвання планеты і іншых глабальных выклікаў.

Прэзідэнт Францыі заклікаў ЗША захаваць адданасць ідэалам супрацоўніцтва перад абліччам такіх пагроз, як тэрарызм і іншыя выклікі.

«Я не падзяляю пачуцці тых, хто зачараваны новымі моцнымі дзяржавамі, адмовай ад свабоды і ілюзіяй нацыяналізму. Мы можам выбраць ізаляцыянізм, сыход у сябе і нацыяналізм — гэта адна з опцый. Яна можа здавацца нам вельмі цікавай як часовыя лекі для нашых страхаў. Але, грукнуўшы дзвярыма, мы не спынім эвалюцыю свету», — заявіў Макрон. Ён таксама заклікаў змагацца з фэйкавымі навінамі.

«Каб абараніць дэмакратыю, мы павінны змагацца з фэйкавымі навінамі, якія распаўсюджваюцца, як вірус», — сказаў Макрон.

Прэзідэнт Францыі стаў першым лідарам замежнай дзяржавы, які наведаў ЗША з дзяржаўным візітам з пачатку прэзідэнцтва Дональда Трампа.

ТРЫ ЧВЭРЦІ ЖЫХАРОЎ УКРАІНЫ ЛІЧАЦЬ, ШТО КРАІНА РАЗВІВАЕЦЦА Ў НЯПРАВІЛЬНЫМ КІРУНКУ

Меркаванне ўкраінцаў аб тым, наколькі правільны курс развіцця абрала іх краіна, вярнулася да «дамайданаўскага» перыяду. Пра гэта сведчаць вынікі даследавання сацыялагічнай групы «Рэйтынг».

«75 % украінцаў бачаць, што краіна развіваецца ў няправільным кірунку», — заявіў кіраўнік сацыялагічнай кампаніі Ігар Цішчанка, грунтуючыся на даных даследавання. Паводле яго слоў, падобныя паказчыкі назіраліся ў перыяд да падзей на кіеўскім «майдане». «Пік здарыўся пасля «майдана»: тады 34 % лічылі развіццё краіны правільным, 48 % — няправільным, гэта значыць цяпер мы вярнуліся да кропак, якія былі да «майдана».

З апытаных рэспандэнтаў 70 % лічаць, што краіне патрэбныя радыкальныя змены, 10 % выбралі варыянт «усё пакінуць так, як цяпер, абы не горш», 16 % адзначылі, што хацелі б, каб было «як раней».

■ На слыху

Нізкая інфляцыя

Інструкцыя Нацбанка павінна астудзіць рост спажывецкага крэдытавання

Белстат паведаміў пра рост заработнай платы сёлета ў сакавіку на 9 % у адносінах да лютага. Такога рыўка не было каля 10 гадоў, адзначыў у сваім паведамленні фінансавы кансультант Міхаіл Грачоў. Эксперт упэўнены, што такімі тэмпамі да канца года мы можам атрымаць сярэднюю заработную плату ў 1200 рублёў. А ці не падарве гэта абяцанні Нацбанка ўтрымаць інфляцыю ў рамках 6 %?

Намеснік старшыні праўлення Нацыянальнага банка Дзмітрый КАЛЕЧЫЦ падчас канферэнцыі «Лічбавыя тэхналогіі» пацвердзіў гатоўнасць рэгулятара ўтрымаць інфляцыю па выніках года ў рамках 6 %. Па яго словах, для гэтага ёсць усе перадумовы.

Па-першае, працэнтная стаўка пакуль застаецца на дзейных значэннях (10,5 %) і наступнае пасяджэнне Нацбанка па гэтым пытанні адбудзецца сёлета толькі 20 чэрвеня. Далей, у панядзелак, 23 красавіка, было абвешчана аб падпісанні Пагаднення аб інфармацыйным узаемадзеянні паміж Нацбанкам і Міністэрствам антыманапольнага рэгулявання і гандлю. Гэтая дамоўленасць дае магчымасць сумеснага рэгулявання спажывецкага рынку, што дазволіць знізіць інфляцыйныя працэсы.

Але ёсць і праблемы. Рост заработнай платы ў адрыве ад росту прадукцыйнасці працы і прыбытковасці рэальнага сектара сапраўды стварае ціск на спажывецкі рынак, што мае патэнцыял разгону інфляцыі. Праўда, калі паглядзець на структуру росту заработнай платы ў сакавіку, то асноўны працэнт (41,4 %) унёс IT-сектар. Там маецца сезонны фактар, калі ў лютым і сакавіку лічбавыя кампаніі выплачваюць супрацоўнікам гадавыя бонусы і прэміі. Таму ёсць падставы меркаваць, што ўжо ў красавіку мы ўбачым іншыя лічбы ў змене заробкаў.

Акрамя гэтага, з 1 мая ўступае ў сілу Інструкцыя Нацбанка ад 6 красавіка аб парадку крэдытавання, некаторыя нормы якой могуць астудзіць рост спажывецкага крэдытавання, якія назіраліся ў канцы 2017 — пачатку 2018 года. Сукупнасць гэтых фактараў дазволіць Нацбанку выканаць задачу па стрымліванні інфляцыі ва ўстаноўленых межах.

Зноў таннее дызель

З 27 красавіка змяняюцца рознічныя цэны на аўтамабільнае паліва. Пра гэта паведамілі ў прэс-службе «Белнафтахіма». У ведамстве адзначаюць, што рознічныя цэны на дызельнае паліва знізяцца на 1 капейку. Літр бензіну AI-92-K5-Еўра прадаецца за 1 рубель 27 капеек, AI-95-K5-Еўра —1 рубель 35 капеек, AI-98-K5-Еўра — 1 рубель 56 капеек, ДП — 1 рубель 35 капеек.

Сяргей КУРКАЧ

■ Ахова працы

КАБ РАБОТА НЕ ШКОДЗІЛА ЗДАРОЎЮ

Няшчасныя выпадкі на вытворчасці будуць расследаваць па-новаму

Пра гэта паведаміў першы намеснік дырэктара дэпартамента дзяржаўнай інспекцыі працы Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Аляксандр СЕМІЧ. «Была вывучана практыка расследаванняў за апошнія гады, разгляд іх у судах. Мэта змен — зрабіць нормы больш зразумелымі, выключыць іх дваякае тлумачэнне», — адзначыў ён.

Па новых правілах (яны ўступілі ў сілу з 20 красавіка) сам пацярпелы можа ўдзельнічаць у расследаванні. Калі гэта няшчасны выпадак са смяротным зыходам, то такое права маюць жонка ці муж загінулага (-ай). Яны могуць знаёміцца з матэрыяламі справы, атрымліваць іх копіі.

Калі работнік атрымаў траўму на тэрыторыі заказчыка, то правесці расследаванне абавязаны не толькі наймальнік, як было раней, але і тая арганізацыя, дзе адбыўся няшчасны выпадак. Скараціўся тэрмін для абскарджання заключэння дзяржаўнага інспектара працы дэпартамента ў пазасудовым парадку — з трох гадоў да аднаго. «Лічым, што гэтага перыяду дастаткова. Па статыстыцы, 71 працэнт абскарджанняў адбываецца на працягу года», — растлумачыў Аляксандр Семіч.

Устанаўліваць прафесійны характар хранічных захворванняў будуць толькі спецыялісты медыка-экспертнай камісіі. Яе склад зацвярджае Міністэрства аховы здароўя.

Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ

■ Ну і ну!

Прадавец украў 187 пар абутку

Ва УУС адміністрацыі Цэнтральнага раёна сталіцы паступіла заява ад дырэктара крамы, размешчанай у адным з гандлёвых цэнтраў, аб крадзяжы 187 пар абутку.

Аператыўнікі ўстанавілі, што да злачынства мае дачыненне 32-гадовы мінчанін, які раней працаваў у гэтай краме прадаўцом. Паўтара года мужчына прысвойваў частку выручкі ад продажу — пры складанні справаздач аб выручаных за тыдзень грашовых сродках ён перыядычна ўказваў меншую колькасць прададзеных пар, а розніцу забіраў сабе. З пачатку лістапада мінулага года па сярэдзіну сакавіка бягучага затрыманы ўкраў 187 пар абутку на агульную суму 35 229 рублёў, паведамілі ў Цэнтральным РУУС г. Мінска. Усё адкрылася пасля праведзенай інвентарызацыі, падчас якой і «ўсплыла» недастача. За крадзеж мужчыне «свеціць» пазбаўленне волі на тэрмін ад 3 да 12 гадоў з канфіскацыяй маёмасці.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ЯК ПАЛЕПШЫЦЬ ЖЫЦЦЁ ЛЮДЗЕЙ З АСАБЛІВАСЦЯМІ?

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Вельмі важна забяспечыць для іх бесперашкодны доступ да жылых аб'ектаў, як і да аб'ектаў сацыяльных, інжынерных, транспартных, да ўсёй інфраструктуры ўвогуле. Для гэтага трэба заканадаўча адрэгуляваць парадак уладкавання безбар'ернага асяроддзя ў дамах і кватэрах, дзе жывуць інваліды і сем'і, якія маюць у сваім складзе інвалідаў, а таксама ўладкавання безбар'ернага асяроддзя ў месцах агульнага карыстання.

Бо нярэдкія выпадкі, калі чалавек на калясцы падняўся па пандусе, але ўвайсці ў будынак не можа. Чаму? Альбо шырыня дзвярэй не адпавядае нарматывам, альбо аказваюцца яшчэ прыступкі, па якіх узлезці чалавек з інваліднасцю не ў стане. Так, у нашым заканадаўстве ёсць усе адпаведныя нормы, але практыка паказвае, што часта ўзнікае шмат пытанняў, асабліва гэта датычыцца ўладкавання безбар'ернага асяроддзя ў месцы пражывання інваліда. Напрыклад, у нас у многіх будынках ліфты чамусьці пачынаюцца з другога паверха і пандусаў да іх няма. Мы стараемся выправіць памылкі будаўніцтва мінулых гадоў, але гэта адбываецца з вялікай цяжкасцю. І чалавеку з інваліднасцю часта даводзіцца прыкладаць шмат намаганняў, каб скарыстацца сваім правам на даступнае асяроддзе.

Або яшчэ прыклад: у многіх мінскіх гасцініцах ужо абсталяваны нумары для людзей з інваліднасцю. Але, як адзначыў намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны, грамадскі кантроль выявіў, што толькі малая іх частка адпавядае тым патрабаванням, якія б забяспечвалі бесперашкодны доступ для людзей з інваліднасцю. Таму неабходна прапісаць пытанні кантролю і адказнасці за невыкананне ўстаноўленых патрабаванняў па стварэнні безбар'ернага асяроддзя.

А што такое сітуацыйная дапамога? У законе трэба распісаць, што гэта значыць, прапісаць нормы і ўрэгуляваць парадак яе аказання чалавеку з любым відам інваліднасці. Якую канкрэтна ён будзе атрымліваць дапамогу? Якой будзе адказнасць за неаказанне або неналежнае аказанне такой дапамогі?

Калі ўзяць сітуацыю з адаптацыяй і сацыяльнай рэабілітацыяй людзей з інваліднасцю, то іх немагчыма назваць паўнавартаснымі, калі ў выніку інваліды не змогуць працаваць. Калі чалавек хоча працаваць, грамадства павінна забяспечыць яму гэтае права. Для гэтага існуе механізм квот. Калі гэта будзе прапісана заканадаўча, кіраўнікі прадпрыемстваў будуць бачыць і сваю асабістую адказнасць за сацыяльную адаптацыю інвалідаў: ёсць пэўныя квоты і столькі чалавек з інваліднасцю яны павінны прыняць на працу. І трэба абсталяваць працоўныя месцы для гэтых людзей, стварыць неабходную інфраструктуру, якая будзе забяспечваць магчымасць руху і г. д.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Увогуле, ужо зразумела, што ў гэтай працы павінна ўдзельнічаць усё грамадства, а не толькі адно Міністэрства працы і сацыяльнай абароны.

* * *

Важныя новаўвядзенні, якія датычацца людзей з інваліднасцю, плануе ўнесці ў сваю працу Міністэрства аховы здароўя. Ведамства зараз пачынае работу над пілотным праектам па вызначэнні інваліднасці па новым крытэрыі. Разам з трыма групамі інваліднасці плануецца вызначаць яшчэ і працэнт ступені выяўленасці парушэння функцыі арганізма. Ён будзе вар'іравацца ад 10 да 100 працэнтаў з крокам у 10 працэнтаў, што, на думку многіх спецыялістаў, дасць магчымасць больш аб'ектыўна падыходзіць да ўстанаўлення інваліднасці. У Міністэрстве аховы здароўя плануюць адпрацаваць гэта новаўвядзенне ў некалькіх раёнах краіны, пры станоўчых выніках яно будзе замацавана нарматыўна, заявіла **намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення арганізацыі медыцынскай дапамогі і экспертызы — начальнік упраўлення медыцынскай экспертызы Ірына КІРЭЕВА.**

Дыскусійным аказалася пытанне, звязанае з увядзеннем адказнасці чалавека з інваліднасцю за ўхіленне і адмову ад рэалізацыі індывідуальнай праграмы рэабілітацыі. Міністэрства аховы здароўя прапануе такое новаўвядзенне ў сувязі з вельмі высокім працэнтам невыканання праграмы прафесійнай рэабілітацыі інвалідаў. Зразумела, што ў ведамстве ёсць важкія аргументы для такога рашэння. Але свае аргументы выказалі і ўдзельнікі пасяджэння. Так, **старшыня Рэспубліканскай асацыяцыі інвалідаў-калясачнікаў Яўген ШАЎКО** задаўся пытаннем аб правах пацыента, у якіх запісана, што кожны грамадзянін мае права адмовіцца ад лячэння. А **старшыня Беларускага таварыства інвалідаў Уладзімір ПАТАПЕНКА** адзначыў, што пры складанні гэтай праграмы трэба ацэньваць не толькі медыцынскія, але і сацыяльныя фактары. Як і **дырэктар Офіса па правах людзей з інваліднасцю Сяргей ДРАЗДОЎСКІ**, які заявіў, што МРЭК вызначае праграму рэабілітацыі зыходзячы ў асноўным з дыягназу і практычна не ўлічвае сацыяльнае асяроддзе, у якім жыве чалавек: вёска гэта ці горад, ёсць там нейкая інфраструктура ці няма... «Мы пакуль ідзём па медыцынскім шляху, калі ацэньваем толькі парушэнні здароўя і не ацэньваем працэнт уключанасці чалавека ў навакольнае жыццё, — заявіў Сяргей Драздоўскі. — Гэта важна, але гэтага недастаткова. Таму што бывае, што фармальна чалавек быццам бы не падыходзіць пад азначэнне інваліда, але ён жыве ў стане інваліднасці, таму што навакольнае асяроддзе навязвае яму гэты стан. І гэтую праблему трэба вырашаць...»

Гэта, дарэчы, асноўнае пытанне, якое стаіць перад спецыялістамі і нашым грамадствам у цэлым: як перастаць бачыць у інваліднасці толькі медыцынскую праблему і зразумець, што гэта ў першую чаргу праблема сацыяльная? Важным момантам з'яўляецца і тое, што **да самага апошняга часу ў Беларусі чалавек з інваліднасцю разглядаўся як аб'ект сацыяльнай падтрымкі, але цяпер, з прыняццем і ратыфікацыяй Канвенцыі ААН аб правах інвалідаў, сітуацыя кардынальна змянілася, ператварыўшы чалавека з інваліднасцю з аб'екта сацыяльнай абароны ў паўнапраўнага ўдзельніка адносін па выкананні і рэалізацыі ўласных правоў.**

✓ Усяго ў Беларусі налічваецца 564 967 чалавек з інваліднасцю (па стане на 1 студзеня 2018 года). З іх 87 930 маюць інваліднасць 1 групы, 265 510 — 2 групы і 180 522 — 3 групы. У краіне таксама ёсць 31 005 дзяцей-інвалідаў ва ўзросце да 18 гадоў.

✓ Больш за ўсё людзей з інваліднасцю ў Мінску (124 681 чалавек) і Гомельскай вобласці (91 398 чалавек). Менш за ўсё — у Віцебскай вобласці (58 744).

Незвычайны праект

У нашай краіне стартаваў незвычайны сацыяльны праект: яго арганізатары прапануюць дапамагаць людзям, якія маюць патрэбу ў гэтым, з дапамогай пластыкавых накрывак.

У Беларусі зараз жывуць амаль 565 тысяч дзяцей і дарослых, якія маюць інваліднасць. Не ўсім з іх хапае дзяржаўнага фінансавання на лячэнне і рэабілітацыю. Прывядзём яшчэ некалькі лічбаў, якія на першы погляд не маюць дачынення да праблем людзей з інваліднасцю: на мінскіх звалках за год назапашваецца больш за 800 тон пластыкавых накрывак ад бутэлек з-пад напояў, бытавых парфумерыі і хіміі. А ва ўсёй краіне штогод на звалках збіраецца каля 4 тысяч тон такіх накрывак — агульным коштам больш за $800 000. Арганізатары праекта «Новае жыццё ў абмен на накрыўкі» прапануюць усім нам не адпраўляць накрыўкі на звалкі, а збіраць у адмысловыя фірменныя кантэйнеры, устаноўленыя ў гандлёвых цэнтрах, універсітэтах, школах, дзіцячых садках, кафэ, офісах і нават пад'ездах. Пасля збору ўся другасная сыравіна будзе перададзена перапрацоўчым арганізацыям, а за кошт сродкаў, атрыманых ад яе продажу, будуць набытыя медыкаменты, медыцынскі інвентар і абсталяванне і перададзены хворым.

«Мы абавязкова будзем асвятляць у СМІ перадачу атрыманых сродкаў у дзіцячыя дамы і людзям з інваліднасцю», — абяцае **адзін з арганізатараў Мікалай ЗАЯЦ**. Акцыя ўжо ахоплівае такія гарады, як Мінск, Ліда, Гомель, Брэст. На дадзены момант, паводле папярэдніх ацэнак, ужо сабрана каля 10 тон накрывак. У найбліжэйшых планах арганізатараў — пашырыць геаграфію збору, таксама яны шукаюць партнёраў, якія пагадзіліся б вырабляць фірменныя кантэйнеры.

Святлана БУСЬКО.

■ Прававая гасцёўня

МЯНЯЮЧЫ РАБОТУ, ДУМАЙ ПРА ЎЗРОСТ

Асабліва калі стаіш у чарзе на жыллё як маладая сям'я

У 2009 годзе па месцы маёй працы я і жонка як асобы, якія ўпершыню пабраліся шлюбам, былі прынятыя на ўлік грамадзян, што маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў. Мы жывём разам з цешчай у двухпакаёвай кватэры агульнай плошчай 49 м². У снежні 2017-га я пераводам уладкаваўся на новае месца працы. Я падаваў заяву аб пастаноўцы на ўлік грамадзян, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў... Але мне адмовілі, паколькі нам з жонкай споўнілася па 32 гады. Маёмасны стан маёй сям'і з 2009 года не змяніўся. Ці правамерна мне адмовілі на новым месцы працы?

Сяргей А., *г. Мінск*

На пытанне адказвае **Святлана ПАЎЛЮЧЭНКАВА, кансультант упраўлення прававога рэгулявання сацыяльнай дзейнасці дзяржавы галоўнага ўпраўлення нарматворчай дзейнасці ў сферы дзяржаўнага будаўніцтва Міністэрства юстыцыі Беларусі:**

— На жаль, так. На новым месцы працы вас з жонкай не маглі прыняць на ўлік асоб, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, у якасці маладой сям'і, паколькі пры пастаноўцы на ўлік з гэтай прычыны ўлічваецца не толькі маёмасны стан, а і ўзрост. Па законе, хоць бы адзін з сужэнцаў павінен быць не старэй за 31 год, каб лічыцца маладой сям'ёй.

Пытанні ўліку грамадзян, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, урэгуляваны Палажэннем аб уліку грамадзян, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, і аб парадку выдзялення жылых памяшканняў дзяржаўнага жыллёвага фонду. Гэты дакумент зацверджаны Указам Прэзідэнта Беларусі ад 16 снежня 2013 года № 563 «Аб некаторых пытаннях прававога рэгулявання жыллёвых адносін».

Пры пераводзе грамадзяніна, які стаіць на ўліку асоб, што маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, на работу ў іншую арганізацыю ён прымаецца на ўлік па новым месцы працы з часу пастаноўкі яго на ўлік на мінулым месцы. Пры гэтым арганізацыя па новым месцы працы запытвае ва ўстаноўленым парадку з мінулай работы чалавека яго ўліковую справу.

На новым месцы грамадзяніна прымаюць на ўлік як асобу, якая мае патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, пры наяўнасці ў яго падстаў для гэтага, якія пералічаны ў пункце 3 Палажэння і дзейнічаюць на дату падачы заявы. Падаць заяву на ўлік на новым месцы працы неабходна не пазней за шэсць месяцаў з пачатку работы.

На мінулым месцы працы вы з жонкай стаялі на ўліку асоб, што маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, як грамадзяне, якія ўпершыню пабраліся шлюбам і не маюць асобнага жылля ва ўласнасці. У сувязі з пераводам на работу ў іншую арганізацыю на папярэднім месцы вас знялі з уліку грамадзян, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў.

Цяпер, каб прыняць вас на ўлік на новай рабоце як маладую сям'ю, трэба адпавядаць адразу некалькім умовам. Згодна са зменамі ў заканадаўстве, узрост хоць бы аднаго з сужэнцаў павінен быць менш за 31 год. Неабходна, каб для абодвух гэта быў першы шлюб. Ні ў мужа, ні ў жонкі не павінна быць ва ўласнасці жылля і (або) ніводзін з іх не можа быць наймальнікам жылля па дагаворы найму жылога памяшкання дзяржаўнага жыллёвага фонду, займаць аб'ект долевага будаўніцтва па дагаворы найму, арэнды, бязвыплатнага карыстання ці іншым дагаворы.

Такім чынам у вашым выпадку на момант пастаноўкі вас на ўлік на новым месцы працы змяніліся крытэрыі, згодна з якімі вы раней лічыліся асобамі, што маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў. Таму вас і не маглі прыняць на ўлік як маладую сям'ю.

Калі ў вас з'явяцца іншыя падставы для прызнання асобамі, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, прадугледжаныя пунктам 3 Палажэння, пытанне аб прыняцці на ўлік будзе разгледжана пры ўмове прадстаўлення дакументаў, якія пацвярджаюць гэтую магчымасць, з даты падачы заявы аб пастаноўцы на такі ўлік.

Шаноўныя чытачы, калі ў вас узніклі пытанні юрыдычнага характару, дасылайце іх на наш паштовы або электронны адрас sidarok@zviazda.by. У «Прававой гасцёўні» разам са спецыялістамі Мінюста і іншых ведамстваў мы будзем шукаць на іх адказы

«...БО ПОБАЧ З ДЗЕЦЬМІ ЗАЎСЁДЫ БОГ»

Галоўная цацка ў цяперашніх дзяцей — камп'ютар у розных яго іпастасях. Зрабіць што-небудзь самім (тую ж лусту хлеба адрэзаць) дзесяцігадовы хлапчук часцяком не ўмее. Што зусім не дзіва: бацькі асцерагаюцца даваць яму нож...

У час майго дзяцінства цацкі мы рабілі сабе самі, і галоўнай з іх была рагатка. Не без таго, здаралася, падчас «вытворчасці» рэзалі пальцы, але кроў не спыняла нашу работу: былі б матэрыялы!

Якія?

На выраб першай маёй рагаткі пайшла старая грэлка. З яе было цяжка страляць ды і паслужыла яна нядоўга.

Новую мы з сябрам Колькам зрабілі з веласіпеднай камеры. Абнавілі: доўга стралялі па бутэльках, а потым, стаміўшыся, селі адпачыць каля нашых варот. Знізу пад імі была дошка, і Колька ад няма чаго рабіць паваліў яе — рукой.

Мне прыйшлося згойсаць у двор — паставіць дошку на месца.

Пакуль прыбег назад, Колька паваліў яе.

— Ты што — здурнеў? Болей так не рабі! — накінуўся я на сябра і зноў пабег у двор, каб падняць дошку. Пакуль падняў...

Усё, карацей, паўтарылася.

І тады я вельмі раззлаваўся: моўчкі і чарговы раз паправіўшы дошку, я падняў добры камень і «зарадзіў» ім рагатку, выйшаў на вуліцу і паволі рушыў да Колькі. Той у гэты час... зноў выбіў дошку.

Чаму нагой, я зразумеў тут жа, бо, «стрэліўшы» з рагаткі яму ў лоб, адразу ж схапіўся за свой: Колька «стрэліў» у мяне...

Мы маглі (ды што там — павінны былі!) павыбіваць адзін аднаму вочы, але...

Другім разам мы, некалькі хлапчукоў, гулялі ў двары таго ж самага Колькі. У руцэ ў яго была важкая батарэйка да плоскага ліхтарыка, і ён (не ведаю, што на яго найшло?) размахнуўся і шпурнуў яе ў чародку сваіх курэй.

Зноў жа не ведаю, наўмысна ці не, але батарэйка трапіла ў пеўня і той упаў як падкошаны.

Спалоханы Колька кінуўся да яго, паставіў птушку на ногі, трохі патрымаў, адпусціў — певень зноў паваліўся.

— Пеця, стой, не памірай! — праз слёзы прасіў яго Колька. Але певень падаў і падаў...

Спытаеце, што ў гэты час рабілі мы?

Ці паверыце, — рагаталі (дзеці і сапраўды часам дурныя і жорсткія).

Рагаталі найболей з Колькі, бо ведалі, што слёзы яго няшчырыя, што плача ён не па пеўні, а па ўласным заднім месцы, якому дастанецца ад бацькоў не менш, чым гэтаму пеўню...

Ад непазбежнай, як здавалася, лупцоўкі Кольку ўратавала... яго ж ахвяра: пявун нібыта пачуў дзіцячыя «малітвы», ён раптам... ачуняў: стаў на ногі, страсянуў сваім пер'ем, як нічога ніякага пайшоў да курэй.

Карацей, і гэтае свавольства скончылася добра. Можа, таму, што побач з дзецьмі заўсёды Бог.

Яўген Шастакоў,

г. Гомель.

І ДОМА, І ЗАМУЖАМ

...Усё, вучоба скончана, вечарам — выпускны. А там, як вядома, і музыка, і танцы, і смех, але ж мне — зусім не да іх. І прычына таму самая банальная: у мяне другі дзень ні ежы, ні грошай. І дамоў я траплю толькі праз суткі.

Гэтыя беспрасветныя думкі абрывае нечы спагадлівы голас:

— Што — сумнавата без мужа? Ён не прыйшоў?

Пытае пра гэта адна з выкладчыц, і я, можна сказаць, даўлюся сваім абураным «Які яшчэ муж?!», бо ўспамінаю, што выкладчыкі і праўда лічаць мяне замужняй.

Чаму? Раскажу.

Так атрымалася, што на першым курсе я прапусціла цэлы тыдзень заняткаў. Ды і потым з'явілася на іх, можна сказаць, не спаўшы (цягнік прыходзіў у 8 раніцы), проста з вакзала... Факт, што выклікаюць мяне, пра нешта пытаюцца, а я, што называецца, ні сном ні духам — нават тэмы не ведаю: стаю — слуп слупам... Бо не расказваць жа ўсім, што бацькоў у мяне няма, што за іх — старэйшая сястра, што яна якраз захварэла, што і яе, і гаспадарку трэба было даглядаць... І даведку аб гэтым мне б ніхто не даў...

Карацей, я разгублена маўчала. І тут на выручку мне прыйшла сяброўка:

— Маргарыта Давыдаўна, — звярнулася яна да выкладчыцы, — павіншуйце Чыгрынаву, яна замуж выйшла!

— Віншую, — не то вінавата, не то здзіўлена прамовіла жанчына. — Ну вядома ж, віншую вас! Сядайце.

Такім чынам 1 красавіка (не так важна, якога года) мяне, што называецца, выдалі замуж першы раз.

Хутка я «выйшла» зноў.

Пасля вучобы мяне накіравалі на працу ў Барысаўскі раён. Там у аддзеле культуры прапанавалі на выбар дзве вёскі Вяляцічы ды Аздзяцічы і не то жартам, не то ўсур'ёз сказалі, што ў першай могуць пабіць, а ў другой — накарміць, напаіць, а потым абгаварыць.

«Бітай быць не хачу, а плёткі да мяне не прыстануць», — уголас падумала я і апынулася ў Аздзяцічах. Знайшла там кватэру, пазнаёмілася са сваім начальствам, потым з'ездзіла дадому рэчы забраць. Час вяртацца назад, а як, калі білетаў на цягнік няма і не прадбачыцца? Выходзіць, што працоўную дзейнасць я пачну з прагулу?!

Ад адной гэтай думкі мароз па скуры!

І тут, бачу, міма праходзіць група чыгуначнікаў. І аднаго з іх я, здаецца, бачыла ў Магілёве. Падбягаю, вітаюся, кажу:

— А я ваша суседка! Мы побач жывём... Але зараз мне вельмі трэба ў Барысаў. Ну вельмі...

— І мужу таксама? — усміхаецца ў адказ мужчына, гледзячы мне за плячо.

— А як жа, — чуецца адтуль, і кажа гэта... нейкі вайсковец. Ды яшчэ з дзіцем...

У выніку «суседу»-чыгуначніку нічога не застаецца, як падвесці нас да брыгадзіра поезда ды сказаць:

— Вазьмі гэту пару.

Цуды здараюцца: той сапраўды бярэ нас! Мы — у тамбуры, брыгадзір выдае білеты і тут...

Дзіця, якое дагэтуль маўчала, на ўвесь голас крычыць:

— Ты не мая мама! Не мая! Адыдзіся ад таты! Чуеш?!.

Мне хоць скрозь зямлю праваліся: за разлучніцу зараз прымуць...

Брыгадзір, на шчасце, ні на што не звярнуў увагі: выдаў білеты і знік.

А мяне пасля гэтага дурны нейкі смех разабраў! «Муж» далучыўся... Сынок яго таксама не вытрымаў: мы рагаталі разам, да слёз!

Напэўна, таму да Барысава даехалі досыць хутка, а ўжо там разышліся, як у моры караблі: кожны ў свой бок.

...Трэці раз я выходзіла замуж ужо па-людску: і ўсур'ёз, і на ўсё жыццё.

Л. М. Чыгрынава,

г. Мінск.

БЕДНЫ ПЕЦЯ

Вы не думалі, чаму ў Амерыцы бізнес такі раскручаны, моцны, а мы столькі часу вучымся, стажыруемся, б'ёмся, але прабіцца на больш-менш прымальны ўзровень так і не можам?

Мне здаецца, што прычына тут відавочная: бізнесоўцаў трэба выхоўваць змалку, можа, нават у спецыяльных школах, з адмысловымі педагогамі... Не кажучы ўжо пра сям'ю, пра бацькоў. Яны — амерыканскія і нашы — ну вельмі розныя. Першыя, наколькі ведаю, ледзь не з пялёнак прывучаюць малых да самастойнасці, да таго, што на ўсё (а тым больш на смачную цукерку) трэба зарабіць, што разлічваць можна толькі на сябе...

А вось нашы бацькі, наадварот, — лічаць, што, калі нарадзілі дзяцей, значыць, павінны і забяспечваць. Спачатку — іх шчаслівае маленства, потым юнацтва, сталасць, а калі пашчасціць, дык яшчэ і старасць. Яны, бацькі, як належнае прымаюць просьбы нашчадкаў даць грошай на марозіва, на дыскатэку, на планшэт і тэлефон, на вучобу, машыну, кватэру, дачу і гэтак далей...

Зрэшты, асобныя з малых усё ж спрабуюць зарабляць самі! І раней спрабавалі таксама.

...У знаёмых вяскоўцаў першым нарадзіўся сын, пазней, недзе гадкоў праз шэсць ці сем, у сям'і з'явілася дзяўчынка.

З гэтай нагоды бацькі па завядзёнцы вырашылі гасцей сабраць. І добрыя атрымаліся б хрэсьбіны, калі б не сынок.

Ён што тады ўдумаў? Згледзеў, што бацька ў каморы бярэ бутэлькі з самагонам, носіць на сталы, пакідае, а ўзамен нічога не бярэ. «Гэта ж непарадак, — падумаў малы, — і наладзіў... гандаль: нацягаў з каморы поўных паўлітровак і з дзясятак прадаў — за сваім жа хлявом.

Ці шмат утаргаваў? Ды будзь здароў! За тую брыду (малы пакаштаваў), якая была ў бутэльках, «фарбавала» ў чырвонае твары ды «заплятала» языкі дарослым дзядзькам, ён зарабіў амаль прыгаршчы цукерак — смачных, салодкіх, у прыгожых абгортках!..

Бацькам бы пахваліць гэтае дзіця, пагладзіць яго па галоўцы, а тыя наадварот — пакрыўдзілі Пецьку.

Цяпер, відавочна, шкадуюць: маці, ва ўсякім разе, гаворыць, што бедны ён, працуе звычайным кіроўцам, не змог прыстасавацца да рынку, не змог нікуды прабіцца. У адрозненне ад тых жа сясцёр, якія ўмеюць круціцца і жывуць куды багацей...

А хто ў гэтым вінаваты? Ці не самі ж бацькі: не накруцілі б вушы хлапцу (ды перад гасцямі...), не адбілі б тым самым ахвоту да пошукаў выгады, можа, ён бы новым Абрамовічам стаў. А так...

Маем, што маем.

Іван Гаральчук,

г. Мінск.

Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.

Годовой отчет за 2017 год ООО «Санта Ритейл»

Годовой бухгалтерский баланс за 2017 год утвержден на очередном общем собрании участников ООО «Санта Ритейл» 30.03.2018 года (протокол № 8)

Активы	Код строки	На 31.12.2017	На 31.12.2016
1	2	3	4
I. ДОЛГОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ			
Основные средства	110	51248	36845
Нематериальные активы	120	1118	397
Вложения в долгосрочные активы	140	2841	1941
Долгосрочные финансовые вложения	150	2377	2066
ИТОГО по разделу I	**190**	**57584**	**41249**
II. КРАТКОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ			
Запасы	210	14687	10103
в том числе: материалы	211	801	464
готовая продукция и товары	214	13886	9639
Расходы будущих периодов	230	175	101
Налог на добавленную стоимость по приобретенным товарам, работам, услугам	240	548	13
Краткосрочная дебиторская задолженность	250	2767	1861
Краткосрочные финансовые вложения	260	14370	
Денежные средства и их эквиваленты	270	5451	3390
ИТОГО по разделу II	**290**	**37998**	**15468**
БАЛАНС	**300**	**95582**	**56717**
Собственный капитал и обязательства	**Код строки**	**На 31.12.2017**	**На 31.12.2016**
1	2	3	4
III. СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ			
Уставный капитал	410	34288	16302
Резервный капитал	440	15	15
Добавочный капитал	450	1950	1950
Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток)	460	7030	4287
ИТОГО по разделу III	**490**	**43283**	**22554**
IV. ДОЛГОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА			
Долгосрочные кредиты и займы	510	20693	13380
Отложенные налоговые обязательства	530	45	27
Доходы будущих периодов	540	2	5
ИТОГО по разделу IV		**20740**	**13412**
V. КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА			
Краткосрочные кредиты и займы	610	400	
Краткосрочная часть долгосрочных обязательств	620	600	
Краткосрочная кредиторская задолженность	630	30555	20747
в том числе: поставщикам, подрядчикам, исполнителям	631	28857	19192
по авансам полученным	632	6	1
по налогам и сборам	633	127	112
по социальному страхованию и обеспечению	634	232	128
по оплате труда	635	865	595
по лизинговым платежам	636	428	
прочим кредиторам	638	40	719
Доходы будущих периодов	650	4	4
ИТОГО по разделу V	**690**	**31559**	**20751**
БАЛАНС	**700**	**95582**	**56717**

Отчет о прибылях и убытках
за январь – декабрь 2017 года

тыс. руб.

Наименование показателей	Код строки	За январь – декабрь 2017	За январь – декабрь 2016
— Летась да нас па размеркаванні 130 чалавек прыехала, і толькі 40 пакінулі раён. Ураджэнцы ў абсалютнай большасці застаюцца і працуюць на сваёй зямлі. Радуе, што многія падчас вучобы жэняцца ці замуж выходзяць, а потым сюды вяртаюцца ўжо з другой палавінкай. Практычна ва ўсіх галінах у нас закрыты вакансіі. Такая сітуацыя — вынік дзеяння дзяржаўных праграм, якія садзейнічалі таму, каб людзі былі зацікаўлены заставацца ў родных мясцінах. Напрыклад, у нас сёння актыўна будуецца жыллё для маладых спецыялістаў. Людзі атрымліваюць кватэры і дамы. Штогод у Хойніках мы будуем па адным доме: гэта 40—60 кватэр для маладых спецыялістаў. Ёсць пэўныя даплаты, якія дапамагаюць маладому спецыялісту набыць мэблю і ўсё іншае неабходнае. Умовы ёсць, ёсць магчымасць зарабляць грошы. Можа, таму і нараджальнасць у нас на высокім узроўні. У 2016 годзе па ёй мы нават былі лідарамі ў вобласці. Тады за год нарадзілася 318 дзетак.

стар. 14

«РАНЫ» НА КАРЦЕ

У чым асаблівасці жыцця на тэрыторыі з узроўнем радыяцыі ад 5 да 15 кюры на квадратны кіламетр

Першае, што кідаецца ў вочы, калі заходзіш у рабочы кабінет Сяргея Лазарэвіча, — пярэстая карта. Амаль трэць тэрыторыі — шэрага колеру, які месцамі пераходзіць у жоўты або чырвоны. Гэта балючыя месцы рэгіёна, атручаныя «чарнобыльскім» цэзіем і стронцыем. Чырвоны колер — мяжа Краснапольскага, Касцюковіцкага і Чэрыкаўскага раёнаў, дзе радыяцыя перавышае 15 кюры. Тут жыцця няма, замест яго — строгі кантрольна-прапускны рэжым, за парушэнне якога прадугледжана адміністрацыйная адказнасць. У зоне адсялення знаходзяцца буйныя раней вёскі Вепрын, Малінаўка, малая радзіма нашага беларускага песняра Аркадзя Куляшова — Саматэвічы. Летась спецпрадпрыемства «Радон» закончыла тут апошнія работы па зносе пабудоў. На карце яшчэ шмат жоўтага колеру — ім пазначаны тэрыторыі, дзе ўзровень забруджанасці вагаецца ад 5 да 15 кюры. У зоне ўплыву знаходзіцца і Слаўгарад, адзіны з райцэнтраў Магілёўшчыны. Але жыццё тут працягваецца. Як і ў іншых населеных пунктах «жоўтага» колеру. Больш падрабязна пра гэта мы гутарым з Сяргеем ЛАЗАРЭВІЧАМ, намеснікам начальніка аддзела інвестыцый, па праблемах ліквідацыі наступстваў катастрофы на ЧАЭС і надзвычайных сітуацый Камітэта па архітэктуры і будаўніцтве Магілёўскага аблвыканкама. У аддзеле ён працуе пяць гадоў, а раней восем гадоў узначальваў лабараторыю рэабілітацыі забруджаных тэрыторый у магілёўскім філіяле Рэспубліканскага інстытута радыялогіі МНС.

Чарнобыльская «фізіка»

— З моманту аварыі на АЭС прайшло больш за 30 гадоў. Перыяд паўраспаду цэзію і стронцыю ўжо адбыўся, але трэба яшчэ 8—10 такіх перыядаў, каб ад прысутнасці гэтых элементаў нічога не засталося, — кажа суразмоўца. — Павінна прайсці яшчэ не менш за 240 гадоў.

— Значыць, супакойвацца пакуль рана?

— Калі б нехта прыдумаў, як паскорыць працэс распаду радыенуклідаў, гэта быў бы неймаверны прарыў у навуцы. Але пакуль нам трэба мірыцца з тым, што ёсць. Галоўнае, што шчыльнасць цэзію і стронцыю стала меншая, і радыяцыйны фон зменшыўся. Бо не столькі небяспечныя гэтыя хімічныя элементы самі па сабе, колькі іх Y-выпраменьванне, якое адбываецца пры распадзе. Некаторыя дажываюць у такіх умовах і да 90 гадоў, а іншыя пабылі некалькі дзён, атрымалі дозу радыеактыўнага ёду і сёння маюць вялікія праблемы з шчытападобнай залозай. Гэта ўсё індывідуальна. Тут пытанне ўжо да медыцыны, наколькі чалавек да гэтага ўспрымальны і што на яго ўплывае. Для таго каб ацаніць з высокай доляй імавернасці ступень уплыву радыяцыі на наша здароўе, трэба рабіць вельмі вялікія выбаркі, абследаваць вялікую колькасць людзей.

Акрамя ж радыяцыі, існуе шмат фактараў, якія могуць выклікаць хваробу. У прыватнасці, курэнне, алкаголь, нерацыянальнае харчаванне і гэтак далей. Увогуле з дзясятак захворванняў маюць сувязь з радыяцыйнымі фактарамі. Сярод іх — анказахворванне шчытападобнай залозы, некаторыя генетычныя адхіленні, катаракты і прамянёвыя захворванні.

стар. 13

ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЯ, 9

Самакіраванне як прадмет дыялогу

Распачата падрыхтоўка да міжнароднай канферэнцыі з удзелам Савета Еўропы

25 красавіка адбылася сустрэча старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі Міхаіла МЯСНІКОВІЧА з дырэктарам Кангрэса мясцовых і рэгіянальных улад Савета Еўропы Жанам-Філіпам БАЗУЛЕМ.

На сустрэчы былі абмеркаваны пытанні арганізацыі і правядзення ў Мінску міжнароднай канферэнцыі па пытаннях мясцовага самакіравання з удзелам прадстаўнікоў кангрэса.

— Ваш візіт дазволіць узгадніць усе неабходныя працоўныя пытанні — па парадку дня, даце і месцы правядзення канферэнцыі. Гэта будзе пачатак нашай працы ў рамках падрыхтоўкі такога адказнага мерапрыемства са структурамі Савета Еўропы, — адзначыў Міхаіл Мясніковіч. Паводле яго слоў, па гэтай тэматыцы намецілася пазітыўная дынаміка ва ўзаемадзеянні Беларусі з Саветам Еўропы, Кангрэсам мясцовых і рэгіянальных улад. «Гэта абнадзейвае. Мы разлічваем на канструктыўны дыялог. Безумоўна, у нас шмат цікавых ідэй і прапаноў», — падкрэсліў ён.

Старшыня Савета Рэспублікі таксама звярнуў увагу на тое, што пытанні мясцовага самакіравання пастаянна знаходзяцца ў полі зроку верхняй палаты беларускага парламента.

Парламенцкая дыпламатыя

У Савеце Рэспублікі адбыліся сустрэчы з кіраўнікамі дыпламатычных місій Грузіі і Эстоніі ў нашай краіне

З Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Грузіі Валерыем Кварацхелія спікер верхняй палаты парламента Міхаіл Мясніковіч абмеркаваў пытанні гандлёва-эканамічнага і міжпарламенцкага супрацоўніцтва, перспектывы рэалізацыі сумесных праектаў.

На думку Міхаіла Мясніковіча, парламентарыі Беларусі і Грузіі маглі б больш эфектыўна супрацоўнічаць перш за ўсё ў рамках груп дружбы. Беларусь таксама зацікаўлена развіваць партнёрства з Грузіяй у сферы адукацыі і навукі.

У сваю чаргу пасол Грузіі адзначыў высокую цікавасць дзелавых колаў Грузіі да супрацоўніцтва з Беларуссю. У ліку перспектыўных напрамкаў узаемадзеяння ён назваў IT-сферу і ахову здароўя.

З Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Эстоніі ў Рэспубліцы Беларусь Мерыке Кокаеў сустрэўся старшыня Пастаяннай камісіі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Сяргей Рахманаў. На гэтай сустрэчы таксама былі абмеркаваны пытанні гандлёва-эканамічнага і міжпарламенцкага супрацоўніцтва.

У якасці магчымых сфер узаемадзеяння Сяргей Рахманаў назваў IT-тэхналогіі, вытворчасць святлодыёднай, лазернай, рэнтгенаўскай тэхнікі, фармацэўтыку, адукацыю. «Мы гатовыя разглядаць розныя варыянты супрацоўніцтва, у тым ліку і стварэнне сумесных вытворчасцяў, — адзначыў ён. — Напрыклад, разам мы маглі б стварыць нанатэхналагічны цэнтр. Гэта перспектыўны праект, да якога можна было б прыцягнуць і іншых удзельнікаў».

На свае вочы

Сенатары праманіторылі фермы Брэстчыны

У сярэдзіне красавіка, у рамках выканання даручэння Старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі, упаўнаважанага прадстаўніка кіраўніка дзяржавы па Брэсцкай вобласці Міхаіла МЯСНІКОВІЧА, членамі Савета Рэспублікі праведзены маніторынг эфектыўнасці малочнатаварных комплексаў Брэсцкай вобласці.

У склад камісіі, якая ажыццяўляла маніторынг, увайшлі сенатары Ігар Краўчанка, Вольга Леўчанка, Аляксандр Марчанка, Анатоль Шчасны і Аляксандр Шышко.

Члены Савета Рэспублікі наведалі кампаніі: «Кастрычнік-Агра» і «Баравіца» Іванаўскага, «Стытычаўскае» і «Парахонскае» Пінскага, «Роўбіцкае», «Жураўлінае» і «Айчына» Пружанскага раёнаў. Рэканструкцыя і мадэрнізацыя малочнатаварных фермаў (памяшканняў пад утрыманне маладняку) у гэтых гаспадарках у асноўным ажыццяўляецца за кошт уласных сродкаў.

Маніторынг выявіў устойлівы рост па большасці паказчыкаў, якія даследаваліся. Парламентарыі ўпэўніліся, што жывёлагадоўля ў рэгіёне развіваецца дынамічна.

Сенатары адзначылі, што ва ўсіх гаспадарках вядзецца мэтанакіраваная праца па вырошчванні рамонтнага маладняку малочнага напрамку, а гэта ў будучыні дазволіць павялічыць прадукцыйнасць малочнага статка.

Разам з тым у большасці гаспадарак жывёлы не былі адабраныя па прадукцыйнасці і жывой вазе. Заўважылі члены Савета Рэспублікі і недахопы ў некаторых гаспадарках пры загрузцы кармоў, у выніку якіх губляюцца пажыўныя рэчывы ў корме. Яшчэ адна заўвага датычылася павышанай вільготнасці кармавой сумесі, што сведчыць пра парушэнні тэрмінаў нарыхтоўкі кукурузнага сіласу.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.

РАБОЧАЯ СУСТРЭЧА

АБ'ЯДНАЦЬ ІНТАРЭСЫ І АТРЫМАЦЬ ВЫНІКІ

Мясцовае самакіраванне ў фармаце беларуска-еўрапейскага супрацоўніцтва

Праблемы мясцовага самакіравання стануць галоўнай тэмай абмеркавання на міжнароднай канферэнцыі з удзелам прадстаўнікоў Кангрэса мясцовых і рэгіянальных улад Савета Еўропы, якая адбудзецца ў Мінску ў пачатку верасня.

Рабочая сустрэча **старшыні пастаяннай камісіі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі Аляксандра ПАПКОВА** і **дырэктара Кангрэса мясцовых і рэгіянальных улад Савета Еўропы Жана-Філіпа БАЗУЛЯ** прайшла ў фармаце перагавораў у Савеце па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання пры Савеце Рэспублікі Нацыянальнага сходу.

Галоўная тэма абмеркавання — актывізацыя ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва праз правядзенне сумесных мерапрыемстваў з удзелам прадстаўнікоў мясцовых органаў улады, грамадскіх арганізацый, беларускага парламента і прадстаўнікоў мясцовых і рэгіянальных улад еўрапейскіх дзяржаў. Гэтым разам міжнародную канферэнцыю ў фармаце круглага стала запланавана правесці ў Мінску. Сярод пытанняў, якія бакі прапанавалі абмеркаваць на маючым адбыцца форуме, — становішча Еўрапейскай хартыі, вопыт работы асацыяцый мясцовага самакіравання ў Беларусі і еўрапейскіх краінах, праблемы трансгранічнага супрацоўніцтва, а таксама роля мясцовых органаў улады ў развіцці турызму, пераадоленні наступстваў аварыі на Чарнобыльскай станцыі, вырашэнні дэмаграфічных праблем.

На думку Аляксандра Папкова, сёння важна аб'яднаць інтарэсы Беларусі і рэгіянальных улад Савета Еўропы — у мэтах атрымання канкрэтнага выніку сумеснага супрацоўніцтва. «Наша мерапрыемства павінна мець практычную выніковасць. Трэба будзе разам выпрацаваць дарожную карту для работы розных структур на ўзроўні міністэрстваў, ведамстваў, навуковай супольнасці. Хацелася б, каб вынікам правядзення нашага круглага стала стала сумесная рэзалюцыя аб супрацоўніцтве, якая адпавядала б як нашым інтарэсам, так і інтарэсам нашых заходнееўрапейскіх партнёраў», — падкрэсліў парламентарый.

У сваю чаргу дырэктар Кангрэса мясцовых і рэгіянальных улад Савета Еўропы Жан-Філіп Базуль назваў маючую адбыцца міжнародную канферэнцыю па пытаннях мясцовага самакіравання «пунктам адліку нашага супрацоўніцтва». Ён падкрэсліў, што «Кангрэс і Савет Еўропы гатовы да дыялогу з Беларуссю, тут няма месца прадузятым адносінам, мы павінны вучыцца адзін у аднаго».

Падчас рабочай сустрэчы ў Савеце Рэспублікі была адзначана станоўчая дынаміка развіцця адносін паміж нашай краінай і Саветам Еўропы. Кангрэс мясцовых і рэгіянальных улад праяўляе цікавасць да паэтапнага пашырэння супрацоўніцтва. Сёння гэта аб'яднанне налічвае 318 членаў, якія прадстаўляюць больш за 200 000 адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак 47 дзяржаў — членаў Савета Еўропы. Беларусь бачыць супрацоўніцтва з Кангрэсам мясцовых і рэгіянальных улад як магчымасць не толькі для атрымання інфармацыі і знаёмства з вопытам развіцця мясцовага самакіравання ў краінах — членах Савета Еўропы, але і для правядзення двухбаковых сустрэч з замежнымі калегамі.

Плануецца, што ў найбліжэйшы час будзе створана рабочая група, у якую ўвойдуць прадстаўнікі нашага Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання пры Савеце Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі і Кангрэса мясцовых і рэгіянальных улад Савета Еўропы для вывучэння ўсіх пытанняў па арганізацыі міжнароднай канферэнцыі ў фармаце круглага стала ў Мінску.

Наталля БІТЭЛЬ.

БУДЗЕМ ЖЫЦЬ ДАЛЕЙ

Тэме павышэння ролі органаў мясцовага самакіравання ў рашэнні актуальных пытанняў сацыяльна-эканамічнага развіцця было прысвечана выязное пасяджэнне Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання, якое адбылося ўчора ў Слаўгарадзе пад кіраўніцтвам старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі Міхаіла МЯСНІКОВІЧА.

Сімвалічна, што адбылося яно ў дзень 32-й гадавіны з дня аварыі на Чарнобыльскай АЭС. Слаўгарадскі раён пацярпеў ад сур'ёзнага радыеактыўнага забруджвання, па сённяшні дзень у зоне рызыкі знаходзіцца 70 населеных пунктаў, дзе пражывае 13,8 тысячы чалавек — крыху менш за палову насельніцтва раёна. Слаўгарад адзіны на Магілёўшчыне райцэнтр, які знаходзіцца ў зоне радыеактыўнага забруджвання ад 5 да 15 кюры на квадратны кіламетр. Але раён, нягледзячы на ўсе цяжкасці, развіваецца і нават здолеў назапасіць карысны вопыт па пераадольванні наступстваў аварыі і садзейнічанні занятасці насельніцтва. Тут адрадзілі традыцыі старадаўняга сыраварэння і нават заснавалі фестываль «Гаспадарчы сыр», які сёлета будзе адзначацца ўжо сёмы раз. Жыхары Слаўгарадчыны актыўна ўцягваюцца ў прадпрымальніцкую дзейнасць, займаюцца рамесніцтвам, вучацца рэалізоўваць праекты міжнароднай тэхнічнай дапамогі.

Дэпутаты наведалі аб'екты, якія сталі знакавымі ў развіцці гэтай дзейнасці, — Слаўгарадскую сяроднюю школу № 1, Лапаціцкі сельсавет, унікальны музей пад адкрытым небам у аграгарадку Лясная. Вопытам пераадолення наступстваў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС, адаптацыі насельніцтва да пражывання на забруджаных тэрыторыях, стварэння спрыяльных умоў для вядзення ў такіх асаблівых абставінах бізнесу, а таксама павышэння інвестыцыйнай прывабнасці раёна падзяліліся старшыня Слаўгарадскага райсавета дэпутатаў Святлана Язерская, старшыня Лапаціцкага сельскага Савета дэпутатаў Сцяпан Байцоў і іншыя. Народныя абраннікі змаглі таксама азнаёміцца з работай прыватных прадпрыемстваў, якія паспяхова рэалізуюць у раёне свой бізнес, наведаць прэзентацыі-выстаўкі вырабаў мясцовых майстроў, гісторыка-культурныя славутасці раёна.

Нэлі ЗІГУЛЯ.

(Больш падрабязна пра тое, што адбывалася падчас выязнога пасяджэння Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання, чытайце ў наступным нумары «МС».)

ПОГЛЯД ЗБОКУ

ГРОШЫ Ў СМЕТНІЦУ, або Пра што маўчаць яноты

У нашай краіне ўжо не першы год прапагандуюць раздзельны збор смецця. Напэўна, няма чалавека, які б не бачыў рэкламу, дзе яноты заклікаюць да свядомасці грамадзян, каб тыя правільна размяркоўвалі адходы па кантэйнерах. І людзі сапраўды падтрымалі гэтую ініцыятыву. Усё б добра, але ідэальную карціну псуе адно цікавае пытанне: «Вы бачылі калі-небудзь, як збіраюць адходы ў кантэйнеры для раздзельнага збору?» Адказ парадаксальны — усе адсартаваныя другасныя рэсурсы часта скідаюць у адну машыну, каб потым прывезці іх на сартавальныя лініі смеццевага завода. А навошта тады было збіраць раздзельна? Пра тое, хто зарабляе на смецці, хто за гэта плаціць і як можна было зарабіць інакш — чытайце далей.

Бясплатная ініцыятыва?

Сістэмай раздзельнага збору смецця, якая прыйшла да нас з Захаду, у краіне заняліся сур'ёзна. Толькі сёлета павінны заварыць амаль 2000 смеццеправодаў у Мінску. Узамен жыхары сталіцы атрымаюць 130 кантэйнерных пляцовак. Аднак існуе меркаванне, што кансервацыя смеццеправодаў не зробіць нічога добрага, акрамя таго, што палепшыць санітарны стан пад'ездаў. Людзі ж вымушаны будуць пастаянна спускацца з кватэр і сартаваць адходы па кантэйнерах, колькасць якіх павялічыцца каля пад'ездаў у разы.

Варта адзначыць, што ў Еўропе людзей стымулююць да раздзельнага збору другасных рэсурсаў праз дыферэнцаваную сістэму аплаты за набытыя кантэйнеры для раздзельнага збору адходаў. У выпадку, калі працэс сартавання жыхарамі дома парушаецца, то і памер аплаты за кантэйнер павялічваецца. Нас таксама прымушаюць плаціць за збор, сарціроўку і вываз бытавых адходаў і адначасова спрабуюць пераканаць заносіць у кантэйнер другасную сыравіну бясплатна.

Але ж для насельніцтва нашай краіны ёсць альтэрнатыва. У Беларусі шмат гадоў (а дакладней, ужо больш за стагоддзе) дзейнічае сістэма нарыхтоўчых пунктаў другасных рэсурсаў Белкаапсаюза, а таксама Белрэсурсаў, ЖКГ, дзе грамадзянам выплачваюць грошы за прынесеную другасную сыравіну. Аднак сёння кантэйнеры жывуць сваім жыццём, а нарыхтоўчыя пункты — сваім. Прычым, у краіне ствараецца і такая сітуацыя, калі дзве сістэмы збору другаснай сыравіны нават перашкаджаюць адна адной.

Лагічна, што можна было б замест кантэйнераў для раздзельнага збору стварыць нарыхтоўчыя пункты, і жыхары кожнага мікрараёна змаглі б зарабіць грошы на сваіх адходах. Людзі б проста адносілі адсартаваныя макулатуру, шкло, ПЭТ-бутэлькі не ў кантэйнеры, а на нарыхтоўчы пункт. Шмат у чым гэта б вырашыла і тую праблему, калі чалавек выходзіць з кватэры ў шматпавярховым доме і літаральна ўпіраецца ў некалькі кантэйнераў, якія ставяцца каля самага ўвахода ў пад'езд, што сустракаецца даволі часта ўжо не толькі ў Мінску, нават і ў райцэнтрах.

Арганізацыі ЖКГ год ад году пашыраюць колькасць кантэйнераў для раздзельнага збору ў гарадах і малых населеных пунктах. У той жа час таму ж Белкаапсаюзу даволі часта мясцовыя ўлады адмаўляюць у выдзяленні зямлі для стварэння нарыхтоўчых пунктаў другаснай сыравіны, а дзяржаўная ўстанова «Аператар другасных матэрыяльных рэсурсаў» адмаўляе ў фінансаванні закупкі нарыхтоўчых пунктаў — якраз з прычыны наяўнасці кантэйнераў для раздзельнага збору адходаў вакол месца, дзе мог бы размясціцца пункт.

Тут варта растлумачыць, што «Аператар другасных матэрыяльных рэсурсаў» фарміруе фонд і акумулюе грошы на развіццё ў краіне прыёманарыхтоўчай сеткі, кантэйнераў раздзельнага збору, смеццеперапрацоўчых заводаў і г. д.

Такія вось парадоксы

Абслугоўванне кантэйнерных пляцовак у дварах адбываецца часта за кошт сродкаў грамадзян. Атрымліваецца, што мы плацім грошы за абслугоўванне кантэйнерных пляцовак, за вываз смецця і за ўтылізацыю адходаў. Мы бясплатна павінны сабраць адходы, адсартаваць іх і аднесці ў кантэйнер (таму што смеццеправод будзе, хутчэй за ўсё, завараны). І пры гэтым чым больш мы выкінем адходаў у павялічаную колькасць кантэйнераў, тым больш заплацім за яго вываз і, заканамерна, большай будзе сума ў жыроўцы.

Ёсць і яшчэ адзін парадокс. Вельмі часта смеццявоз, які прыязджае, каб сабраць паасобна раскладзеныя адходы, згружае іх усе цалкам у адну кучу. Далей ён перавозіць іх на смеццеперапрацоўчы завод, дзе... зноў пачынаецца працэс сартавання. А гэта зноў жа павялічвае кошт нашай жыроўкі.

Чым адрозніваецца прыёманарыхтоўчы пункт? Там таксама збіраюць адходы раздзельна. Пры гэтым у пункце выплачваюць здатчыкам грошы за другасную сыравіну Далей усё гэта, амаль адразу, асобна вывозіцца на перапрацоўчыя прадпрыемствы краіны, мінуючы сартавальныя лініі. Пры гэтым ажыццяўляецца збор з захоўваннем якасных параметраў другаснай сыравіны, што дазваляе яе больш эфектыўна перапрацаваць з найменшымі стратамі і зноў пусціць у гаспадарчы абарот.

«Мы павінны даць насельніцтву права выбару — выкінуць адходы у кантэйнер, ці аднесці іх у нарыхтоўчы пункт і атрымаць за гэта грошы. Сёння трэба пашырыць і наблізіць прыёманарыхтоўчую сетку да насельніцтва. Варта таксама адзначыць, што ў апошнія гады пашыраецца спектр нарыхтоўваемай другаснай сыравіны (адпрацаваная аўтамабільная аліва, бытавая тэхніка, тэкстыльныя адходы). Атрыманыя ў нарыхтоўчым пункце грошы насельніцтва па жаданні можа накіраваць на аплату часткі жыроўкі», — расказала **начальнік упраўлення нарыхтовак Белкаапсаюза Аксана СКІНДЭР.**

Вось і атрымліваецца, што камунальныя службы не дагаворваюць з дапамогай янотаў пра тое, што на смецці можна было б сэканоміць аплату паслуг ЖКГ. Дарэчы, рыхтуецца яшчэ адна рэклама, дзе яноты будуць вадзіць грамадзян па смеццесартавальным заводзе. Можа, янотам варта было б усё ж правесці экскурсію і па нарыхтоўчым пункце?

Ілья КРЫЖЭВІЧ.

СТАЛІЧНЫЯ АДМЕТНАСЦІ

НА СВАЁЙ ХВАЛІ

Які век адмераны мінскім водакалонкам?

У дзяцінстве калонка, размешчаная непадалёк ад бабулінага прыватнага дома, здавалася сапраўдным цудам. Гэта ж цэлая прыгода: можна набраць вядро вады за лічаныя імгненні, памыць побач машыну, у спякотнае надвор'е ўмыцца самому і нават папіць проста з краніка ледзяной вады... А што можа быць весялей, чым апырскаць адно аднаго і прыйсці дадому абсалютна мокрымі, але шчаслівымі? У дарослым жыцці водаразборная калонка ўжо не бачыцца сімвалам весялосці і бесклапотнасці. Клопатаў якраз хоць адбаўляй: адсутнасць водаправода ў доме наўрад ці будзе асацыявацца з прыгодамі, а ўнушальныя рахункі за карыстанне калонкай — дзякуючы тым самым юным веселунам — могуць прымусіць не тое што ўсміхнуцца, а выпусціць скупую слязу. Мы паспрабавалі высветліць, як змагацца з агульным доступам да калонак і ці доўга яшчэ можна будзе бачыць іх на вуліцах Мінска?

Дарэчы, на дзяцей, якія дарма льюць чыстую ваду, хутчэй за ўсё, нагаворваць не варта. Значная частка з іх нават не падазрае, для чаго патрэбныя гэтыя мудрагелістыя ўстаноўкі. Усё ж калонку інакш як прывітаннем з мінулага стагоддзя не назавеш, бо сталічныя дамы, у якіх няма водаправода, вялікая рэдкасць. Ды і тыя наўрад ці належаць руплівым гаспадарам — часцей за ўсё не ў самых камфортных умовах жывуць праблемныя сем'і і адзінокія пажылыя людзі, у якіх не застаецца ні сіл, ні сродкаў, каб змяніць сітуацыю. Яшчэ адзін варыянт — тыя мінчане, над якімі ледзь не дзясяткамі гадоў вісела пагроза зносу раёна, вось і не праводзілі ў дом камунікацыі. Зараз горад пачаў больш выразна адказваць на пытанні пра планы па зносе. Ды ўвогуле Мінск паступова адыходзіць ад старой прыватнай забудовы, асабліва бліжэй да цэнтра. Але яшчэ многія вулачкі навяваюць думкі не пра велічную сталіцу, а пра зусім іншыя мясціны. Якраз туды, пакуль ёсць такая магчымасць, мы і адправіліся.

Нягледзячы на тое, што адлік часу да заканчэння існавання многіх дамоў у Сельгаспасёлку ідзе на месяцы, атмасфера тут спакойная: то тут, то там, дзе не вельмі высокія агароджы, відаць, як людзі наводзяць у сябе ў дварах парадак пасля зімы. Праўда, пагутарыць згаджаюцца далёка не ўсе. А хто і гатовы, нічога добрага на гэту тэму сказаць не можа. «З маіх суседзяў толькі Іванавіч ваду ў калонцы набірае. Дык, у яго ні кацяняці, ні дзіцяці, а толькі напаўразбураны дом бацькоўскі. Усе грошы спускае на адно, — робіць характэрны жэст Таццяна Пятроўна, якую мы сустракаем па дарозе з крамы. — Ды ён асабліва не пакутуе: ні памыцца, ні прыбрацца, ні бялізну перамыць — нічога не трэба. А я нават думаць не хачу, як бы я без водаправода спраўлялася. У юнацтве па два велізарныя вядры з калодзежа прыносіла, цяпер мне гэта не пад сілу».

Дзеля цікавасці вырашаем падысці да нашай галоўнай «гераіні» — калонкі. Праўда, скарыстацца ёй дакладна не атрымаецца: няма неабходнай ручкі. Дарэчы, як адзначаюць на прадпрыемстве «Вадазбыт» (УП «Мінскводаканал»), менавіта водаразборныя ручкі — самы дзейсны спосаб пачаць выкарыстоўваць калонкі рацыянальна. Спецыяльныя ручкі выдаюць толькі жыхарам навакольных дамоў, якім пітная вада неабходная для побыту. Але, як аказалася, народныя «ўмельцы» без асаблівых цяжкасцяў могуць вырабіць патрэбны рычаг. І ўсё ж такі для гэтага трэба пастарацца, а таму любы сустрэчны не стане праліваць ваду дарэмна. Наогул, галоўная праблема не ў тым, што адкрыць калонку можа кожны, а ў тым, як ён гэтую ваду будзе выкарыстоўваць. Папіць — калі ласка, а вось мыць машыну ці паліваць агарод пітной вадой — усё ж недазваляльная раскоша.

На пачатак гэтага года ў Мінску налічвалася 620 калонак. Пры гэтым за апошнія пяць гадоў іх колькасць зменшылася амаль у два разы. Прынцып, па якім калонку дэмантуюць або адключаюць, просты: у радыусе 100 метраў ад яе не павінна застацца дамоў без водаправода. Але нават калі гэта ўмова выканана, дэмантаваць калонку адразу ж ніхто не будзе. Для пачатку яе адключаць на тры месяцы, каб праверыць, ці не будзе скаргаў ад мясцовых жыхароў. Так што аб тым, што калонкі знікнуць бясследна ў найбліжэйшы час, гаворка пакуль не ідзе. Усё ж падключэнне водаправода — справа добраахвотная. І многія людзі, у якіх яго няма, не занадта з-за гэтага пакутуюць: маўляў, што тут складанага? Прынесці вядро вады — мінімальная зарадка. Зараз у сталіцы адкрыта каля 1800 асабовых рахункаў на карыстанне водакалонкамі.

Дарэчы, спецыяльныя здымныя ручкі — не адзіны спосаб блакавання калонкі. Некаторыя па-старому навешваюць на яе замок, іншыя — карыстаюцца адпаведнай электроннай картай. (Праўда, у Беларусі гэтую тэхналогію не выкарыстоўваюць, калі цікава паглядзець, як яна працуе, трэба ехаць у Расію, напрыклад у Іркуцк або Волагду.)

Па вуліцах Сельгаспасёлка мы гулялі каля дзвюх гадзін. І ці то нам не пашанцавала, ці то так сітуацыя склалася — нам не трапіўся ні адзін чалавек, які набіраў бы ваду з калонкі. Так і стаяць яны самотна, моўчкі нагадваючы аб эпохах, якія незваротна сыходзяць...

Дар'я КАСКО.

Падтрымка, а не ўсплёск радыяфобіі

Павелічэнне матэрыяльнага дабрабыту і стварэнне новых працоўных месцаў — прыярытэты дзяржаўнай палітыкі на пацярпелых ад аварыі на ЧАЭС тэрыторыях. Людзей, якія там жывуць, трэба падтрымліваць як псіхалагічна, так і эканамічна, упэўнены начальнік упраўлення рэабілітацыі пацярпелых тэрыторый Дэпартамента па ліквідацыі наступстваў катастрофы на ЧАЭС Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Валерый БАХАНКО.

— Неабходна рабіць усё магчымае, каб павялічыць заработную плату людзям, што жывуць і працуюць на пацярпелых ад аварыі тэрыторыях, ствараць новыя працоўныя месцы, — адзначыў ён. — Таму прыярытэт дзяржаўнай палітыкі на перспектыву — далейшае зніжэнне рызыкі неспрыяльных наступстваў для здароўя грамадзян, садзейнічанне аднаўленню і ўстойліваму сацыяльна-эканамічнаму развіццю рэгіёна пры безумоўным забеспячэнні патрабаванняў радыяцыйнай бяспекі.

Паступова, дзякуючы падтрымцы дзяржавы, жыццё на гэтых тэрыторыях змяняецца да лепшага, у тым ліку і ў плане радыяцыйнай бяспекі. Так, для атрымання прадукцыі раслінаводства і жывёлагадоўлі, якая адпавядае нарматывам, праводзяцца ахоўныя мерапрыемствы ў галіне сельгасвытворчасці — вапнаванне, унясенне павышаных доз калійных і фосфарных угнаенняў, што дазваляе ў пяць-шэсць разоў зніжаць узровень радыеактыўнасці. Дапамагае ў гэтым працэсе і прымяненне спецыяльных кармавых рацыёнаў, стварэнне культурных пашаў і сенакосаў. За апошнія 25 гадоў у сельскагаспадарчае выкарыстанне ўцягнута больш за 19 тысяч га (ці 7 % ад выведзеных з абароту зямель).

Сацыяльную скіраванасць мае і распрацаваная канцэпцыя саюзнай праграмы сумеснай дзейнасці па прадухіленні наступстваў чарнобыльскай катастрофы на перыяд 2019—2022 гадоў, якая знаходзіцца на ўзгадненні. Па словах Валерыя Баханко, асаблівая ўвага ў ёй будзе ўдзяляцца сацыяльнай абароне і медыцынскаму забеспячэнню, комплексу ахоўных мерапрыемстваў у населеных пунктах, дзе доза радыяцыі можа перавышаць дапушчальныя нормы, падтрымцы сістэмы радыяцыйнага кантролю, вяртанню ў карыстанне выведзеных з абароту зямель з улікам эканамічных патрабаванняў і радыяцыйнай бяспекі.

Не менш важна, на думку спецыяліста, ствараць і псіхалагічныя ўмовы для жыцця людзей на пацярпелых тэрыторыях:

— Сёння «тэма радыяцыі» на гэтых тэрыторыях амаль не гучыць — там жывуць, працуюць, вырошчваюць чыстую прадукцыю. Я сам працаваў дырэктарам саўгаса на тэрыторыях радыеактыўнага забруджвання, за сем гадоў стварыў 14 новых вытворчасцяў. Людзям, якія засталіся там, неабходна матэрыяльная і псіхалагічная падтрымка, а не новы ўсплёск радыяфобіі.

Вераніка КОЛАСАВА.

ДЫЯЛОГ З НАГОДЫ

ЛЮДЗІ ВЫРАТАВАЛІ ГЭТУЮ ЗЯМЛЮ

Тыя, хто адпрацаваў на забруджаных тэрыторыях дзясяткі гадоў, заслугоўваюць асаблівай увагі

НАПЯРЭДАДНІ гадавіны аварыі на Чарнобыльскай АЭС «МС» пагутарыла са старшынёй Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па пытаннях экалогіі, прыродакарыстання і чарнобыльскай катастрофы, дэпутатам ад Быхаўскай акругі № 81 (Быхаўскі, Слаўгарадскі, Краснапольскі, Касцюковіцкі раёны) Таццянай КАНАНЧУК.

— Таццяна Пятроўна, вы пабывалі на сваёй малой радзіме ў апошнія выхадныя?

— Так. Я там бываю часта: падчас кожнага тыдня работы ў акрузе і ў выхадныя.

— Якая там зараз радыяцыйная абстаноўка?

— Сітуацыя пасля 1986 года змянілася істотна. За гэты час частка населеных пунктаў, дзе ўзровень забруджвання радыенуклідамі быў ад 5 да 15 кюры на квадратны кіламетр, перайшла ў пералік населеных пунктаў з узроўнем забруджвання ад 1 да 5 кюры на квадратны кіламетр. Сярод населеных пунктаў, дзе ў глебе захоўваецца досыць высокая канцэнтрацыя радыеактыўных рэчываў, застаюцца Слаўгарад, некалькі аграгарадкоў — Свенск, Гіжэнка, Рэкта, іншыя населеныя пункты.

— Як мяняецца жыццё са змяншэннем радыяцыі?

— Паляпшэнне радыеактыўнай абстаноўкі адбываецца ў выніку дзвюх рэчаў: натуральных працэсаў (пасля завяршэння перыяду паўраспаду радыеактыўных элементаў) і ў выніку захадаў з боку чалавека. У асноўным гаворка пра цэзій-137 і стронцый-90. Іх перыяд жыцця досыць доўгі — больш за 30 гадоў. На працягу пяці чарнобыльскіх праграм праводзяцца ахоўныя мерапрыемствы (вапнаванне глебы, унясенне мінеральных угнаенняў), якія накіраваныя на звязванне радыеактыўных элементаў у глебе, — для таго каб яны не траплялі ў расліны. Гэта дазволіла атрымліваць чыстую прадукцыю. За апошнія гады не было ніводнага выпадку рэгістрацыі забруджанага радыенуклідамі малака нават у прыватным сектары на тэрыторыі маёй акругі. Кароў там пасуць на апрацаваных пашах. Спецыяльныя мерапрыемствы вярнулі вялізную колькасць зямель у сельгасабарот.

Вялікай праблемай пакуль застаецца лясны фонд, дзе мерапрыемствы па абароне ад радыяцыі праводзіць больш складана і яны менш эфектыўныя.

Падчас рэалізацыі першай і другой дзяржаўных праграм па пераадольванні наступстваў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС была праведзена дэзактывацыя глебы ў вялікай колькасці населеных пунктаў, асабліва каля ўстаноў сацыяльнай сферы: школ, дзіцячых садкоў, бальніц. Трэцяя і чацвёртая праграмы былі накіраваныя на рэабілітацыю забруджаных радыенуклідамі тэрыторый, на іх сацыяльна-эканамічнае развіццё.

Галоўная задача пятай праграмы, якая ажыццяўляецца зараз, — пераход на ўстойлівае развіццё гэтых тэрыторый. Мадэрнізуюцца школы, будуюцца фізкультурна-аздараўленчыя цэнтры, малочнатаварныя, свінагадоўчыя комплексы. Сёння, калі недасведчаны чалавек апынецца там, то не ўбачыць ніякага адрознення ад іншых раёнаў. Там працуюць вытворчасць, сацыяльныя аб'екты, развіваецца прадпрымальніцтва. Разам з тым працягваюцца мерапрыемствы па радыяцыйнай абароне.

Сёння па ўсёй краіне на забруджаных радыенуклідамі тэрыторыях пражывае яшчэ каля 1,1 мільёна чалавек у 2193 населеных пунктах. Раней пражывала больш за два мільёны. У 1,7 раза зменшыліся забруджаныя плошчы.

Адзін з самых важных кірункаў, які змяшчаюць усе пяць праграм, — сацыяльная абарона, медыцынскае забеспячэнне, санаторна-курортнае лячэнне і аздараўленне насельніцтва. Усе людзі, якія пражываюць на гэтых тэрыторыях, праходзяць абавязковую дыспансерызацыю, усім дзецям забяспечана бясплатнае аздараўленне і харчаванне ва ўстановах адукацыі. Кірункі гэтыя пастаянна ўдасканальваюцца.

Мы цяпер кажам, што вельмі важна мець у дзіцячых аздараўленчых цэнтрах сучаснае медыцынскае абсталяванне для ранняй дыягностыкі. Гэты кірунак неабходна развіваць, бо да 2056 года ў нас усё яшчэ застанецца 1051 населены пункт на забруджаных радыенуклідамі тэрыторыях.

> Самазаспакаенне ў тых, хто там пражывае, не павінна быць. Трэба кантраляваць прадукцыю. Умовы для гэтага створаны, напрыклад у школах ёсць адпаведныя цэнтры. Трэба абмяжоўваць і наведванне лясоў. Нам жыць з гэтым яшчэ не адно дзесяцігоддзе.

— У вас дазіметр ёсць?

— Не. Што датычыцца дозы выпраменьвання, то гадавы ўзровень не павінен перавышаць 1 мзв (мілізіверт). Я пражыла там усе 32 гады пасля аварыі на ЧАЭС. У красавіку 1986 года заканчвала трэці курс Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Куляшова, і ўжо на чацвёртым курсе вахтавым метадам вучэбную чвэрць працавала ў родным Слаўгарадскім раёне ў школе, бо многія настаўнікі з'ехалі, настаў востры недахоп кадраў. На пятым курсе гэта ўжо было дзве чвэрці. Уся мая працоўная дзейнасць, да абрання ў парламент, праходзіла ў гэтым раёне. А калі працавала старшынёй райсавета, то наведвала і зоны адчужэння. Заўсёды імкнулася выконваць усе санітарныя нормы і патрабаванні для таго, каб вырасціць здаровымі сваіх дзяцей.

— Праблема з кадрамі на гэтых тэрыторыях захоўваецца?

— Пра недахоп кадраў там ужо па вялікім рахунку размова не ідзе. Ёсць цякучасць: маладыя спецыялісты пасля адпрацоўкі з'язджаюць, сыходзяць у дэкрэтныя адпачынкі. Радыяцыі дагэтуль баяцца, але ж у першыя гады была паніка. У месца, адкуль людзі масава выязджаюць, складана кагосьці накіраваць. Хаця... У наш выпускны год адбываўся эксперымент па студэнцкім самакіраванні. Мы павінны былі самі размеркавацца — без удзелу дэканата. З нашага курса выпускалася 125 матэматыкаў і 50 фізікаў. І мы закрылі ўсе «чарнобыльскія» раёны. Сама паехала на сваю радзіму. Цяпер, калі працую ў акрузе, сустракаю сваіх былых аднакурснікаў, якія засталіся, стварылі сем'і, жывуць і працуюць.

Зараз няма ранейшага непрыняцця «чарнобыльскіх раёнаў». Міграцыя не адрозніваецца ад той, што адбываецца ўсюды: людзі пераязджаюць у буйнейшыя населеныя пункты.

> Зараз няма ранейшага непрыняцця «чарнобыльскіх раёнаў». Міграцыя не адрозніваецца ад той, што адбываецца ўсюды: людзі пераязджаюць у буйнейшыя населеныя пункты.

— Якія праблемы надзённыя для гэтых рэгіёнаў?

— Праблемы, якія ўзнікаюць, становяцца больш кропкавымі. Пры далейшым уцягванні зямель, якія пацярпелі ад аварыі, у вытворчасць важна не забываць пра тое, што цэнтральная гаспадарка, скажам, можа знаходзіцца на адносна чыстай тэрыторыі, а палі, на якіх працуюць механізатары, на забруджанай. Аднак, згодна з дзеючым заканадаўствам, такой гаспадарцы ўжо не вылучаюцца сродкі для спецвопраткі. Усе гэтыя нюансы трэба прадумваць.

Сёлета плануецца паступленне ў Палату прадстаўнікоў законапраекта аб карэкціроўцы Закона аб радыяцыйнай бяспецы. Пасля яго прыняцця трэба ўносіць змены ў іншыя нарматыўныя акты. Час мяняецца. Раней радыяцыяй было забруджана 23 % тэрыторыі, цяпер — 11 %, але адзін і той жа чалавек можа працаваць і пражываць і на чыстай тэрыторыі, і на забруджанай. Напэўна, складана гэта ўлічыць, але трэба шукаць магчымасці.

Дзяржава аказала моцную дапамогу для адраджэння гэтых тэрыторый, але вялікую ролю ў гэтым сыграла само насельніцтва. Сваёй верай у родную зямлю, працай без аглядкі на незвычайныя ўмовы людзі выратавалі сваю малую радзіму. Інакш не скажаш. І сёння яны правільна падымаюць пытанне: мы прапрацавалі на забруджаных тэрыторыях 30 гадоў і хацелі б, каб пры выхадзе на пенсію гэта было нейкім чынам улічана. Такі падыход быў бы справядлівы. Пра гэта трэба сёння думаць.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.

ВЕДАЦЬ, ДУМАЦЬ, РАЗУМЕЦЬ... І ПЕРАМАГАЦЬ!

Рэспубліканская тэлевіктарына для школьнікаў «Я ведаю!» набліжаецца да фіналу

Праграм, разлічаных на шырокую аўдыторыю дзяцей і падлеткаў, на нашым тэлебачанні не так і шмат — ды, лічыце, зусім няма. Таму маштабнаму сумеснаму праекту генеральнага прадзюсарскага цэнтра Белтэлерадыёкампаніі і Міністэрства адукацыі, інтэлектуальнаму шоу «Я ведаю!» для вучняў 5—11 класаў, якое стартавала летась, проста наканавана было стаць заўважным і рэйтынгавым.

Георгій КАЛДУН закідвае гульцоў пытаннямі ў студыі...

А Дзмітрый НОВІК разам з педагогамі перажывае за ход турніру ў «настаўніцкай» і падтрымлівае тых, хто выбыў.

Ужо ў гэтую суботу, 28 красавіка, пачнецца серыя з сямі суперфінальных гульняў. Каб зрабіць іх цікавейшымі, арганізатары ўнеслі ў праграму некаторыя змены. Так, школьнікі раскажуць пра сябе, школу і любімых настаўнікаў у самастойна знятых відэароліках. А ў завяршальным туры гульні, калі абодва прэтэндэнты на перамогу не змогуць даць правільны адказ, спраўляцца з пытаннем давядзецца іх настаўнікам...

СТРЭС І ЯК ЯГО ПЕРАМАГЧЫ

Хутка сярод 84 фіналістаў вызначацца абсалютныя пераможцы ў кожнай паралелі, якія атрымаюць не толькі ганаровыя дыпломы і прызы, але і каштоўныя падарункі для ўсяго свайго класа. А пакуль аднакласнікі, бацькі і настаўнікі з хваляваннем чакаюць вынікаў інтэлектуальнага турніру, мы папрасілі падзяліцца ўражаннямі аднаго з яго вядучых **Георгія КАЛДУНА.**

— У цябе багаты вопыт вядзення інтэлектуальных тэлешоу. З кім цяжэй працаваць — з дарослымі або дзецьмі?

— Як паказала практыка, ад узросту мала што залежыць. Калі ёсць магчымасць падладзіцца пад кожную ўзроставую катэгорыю, сарыентавацца, на што яны рэагуюць, якія жарты разумеюць, дзе іх мае сэнс падтрымаць, а дзе крыху заблытаць — тады кожная праграма атрымліваецца адметнай. Дзеці вельмі розныя, і адлегласць нават у адзін год вельмі нават прынцыповая. У нас часам гульні з пятымішостымі класамі выходзілі нашмат лягчэйшымі і забаўнымі, чым са старшакласнікамі, якія, магчыма, занадта заклапочаныя тым, як яны выглядаюць збоку. А пяці-шасцікласнікі — яшчэ дзеці, яны больш непасрэдныя, і ў гэтым ёсць як сваё харство, так і небяспека, што ты чалавека прымусіш заплакаць або ўпасці ў ступар. Каб высветліць, як яны будуць рэагаваць на падзеі на здымачнай пляцоўцы, мы папярэдне сустракаліся і гутарылі з усімі ўдзельнікамі.

Напрыклад, на фразу: «Вы ж разумееце, што калі выбываеце адразу пасля першага тура, то лепшае, што можаце зрабіць — упасці на падлогу, біць нагамі, плакаць і крычаць, што жыццё больш не мае ніякага сэнсу», — адны ківаюць і пагаджаюцца, а другія смяюцца і разумеюць, што гэта жарт... Словам, дзеці розныя, непрадказальныя — як, зрэшты, і дарослыя. Проста ёсць пэўная спецыфіка: з дзецьмі трэба паводзіць сябе, напэўна, больш акуратна і тактоўна, каб іх не пакрыўдзіць. Нават дарослы чалавек перад камерамі губляецца і хвалюецца з непрывычкі, гэта нармальна, а ў дзяцей стрэс яшчэ большы — на першых гульнях было відаць, як моцна на іх цісне атмасфера. Даводзілася нават звяртацца да медыкаў, якія дзяжурылі на ўсіх здымках, каб крыху зменшыць ступень хвалявання. Таму я стараюся паводзіць сябе педагагічна і не толькі падобраму жартую з кагосьці, але перадусім падбадзёрваю ўдзельнікаў, у перапынках часта падыходжу і падказваю, што, напрыклад, у трэцім туры будуць складанасці вось такога кшталту, звяртайце ўвагу на фармулёўкі — проста каб яны не «пасыпаліся» з-за стрэсу, а маглі сканцэнтравацца і найлепшым чынам праявіць сябе.

— Хтосьці з удзельнікаў запомніўся асабліва — магчыма, нават не эрудыцыяй і шырынёй кругагляду, а нейкімі рысамі характару?

— Так, было многа яркіх удзельнікаў. Напрыклад, некалькі вельмі разумных дзяўчат, якія дайшлі да фіналу ў сваіх адборачных гульнях — такія рацыянальныя і лагічныя, што нават не верылася, што гэта ўсяго толькі сёмы ці восьмы клас. Сярод малодшых былі забаўныя, вельмі пазітыўныя персанажы, якія задавалі тон на пляцоўцы — адзін з хлапцоў парадаваў хуткай і прыязнай рэакцыяй на жарты і смешныя сітуацыі, паводзіў сябе так натуральна і свабодна, што было проста прыемна глядзець.

ПЫТАННІ ПРА ПЫТАННІ

Нам з вамі, шаноўныя гледачы, лёгка, седзячы на канапе, уяўляць сябе стратэгамі і абурацца, чаму гэта дзеці не ведаюць Аляксея Калюжнага або саліста ансамбля «Песняры». Але па той бок экрана адчуванні зусім іншыя, і нават элементарнае пытанне можа выбіць з каляіны.

— Я, прызнаюся, у гульнях з удзелам старшакласнікаў не раз і не два лавіла сябе на думцы, як шмат не ведаю... У цябе такія моманты здараліся?

— Натуральна, прычым я ніколі не саромеюся сказаць пра гэта ўголас. Не разумею, чаму ў расійскіх і ўкраінскіх інтэлектуальных шоу такога не адбываецца: у чым праблема, чаму вядучы мусіць уяўляць з сябе крыніцу абсалютных ведаў?.. Многія людзі ведаюць на парадак або на некалькі парадкаў больш за мяне — аднак немагчыма ведаць усё, і гэта нармальна. У праграме мы ні ў якім выпадку не імкнёмся выставіць дзяцей дурнямі альбо, наадварот, гэткімі завучкамі-«батанікамі», таму я папрычым не прынцыпова, сусветнай або гісторыі Беларусі. Я амаль нічога не ведаю з гэтай вобласці, за выключэннем, быць можа, Вялікай Кастрычніцкай рэвалюцыі і Вялікай Айчыннай вайны, за няведанне якіх у школьныя гады мяне зганьбілі б і закідалі тапкамі. Але затое я добра разбіраюся ў іншых рэчах. Вось каб не было такога суб'ектыву, якія пытанні пускаць у эфір, заўжды вырашаецца капярэджваю іх: «Не засмучайцеся, калі не будзеце ведаць правільны адказ, шмат на якія пытанні і дарослыя адказваюць няправільна». Вось адкажы, як звалі лейтэнанта Шміта?..

Па той бок экрана вельмі складана адказваць на пытанні хутка і правільна.

— Спытай што лягчэйшае... Ота?

— Вось якраз той самы выпадак! Я часам задаю гэта пытанне на розных мерапрыемствах і прапаную чатыры варыянты адказу — і амаль заўжды выбіраюць Ота Юльевіча. А гэта вучоны, даследчык Арктыкі, які ніякага дачынення да паўстання на «Ачакаве» не меў, а «таго» Шміта звалі Пётр Пятровіч. І такіх рэчаў, у якіх кожны можа памыліцца, процьма.

«Пяці-шасцікласнікі — яшчэ дзеці, яны больш непасрэдныя, і ў гэтым ёсць як сваё харство, так і небяспека, што ты чалавека прымусіш заплакаць або ўпасці ў ступар».

Вяртаючыся ж да пытанняў «Я ведаю!» — яны разнастайныя. Ёсць элементарныя — накшталт правапісу «жы-шы», ёсць такія, дзе даводзіцца ўключаць логіку і як след падумаць, ёсць тыя, што падаюцца неймаверна складанымі, а ёсць дзіўныя, якія, напрыклад, асабіста я наогул у гульню не ўключаў бы. Але гэта суб'ектыўны і няправільны падыход, і добра, што пытанні падбіраюць людзі з рознымі інтарэсамі. Скажам, асабіста я вельмі далёкі ад тэмы гісторыі, легіяльна.

З-за чаго пытанне могуць забракаваць? Напрыклад, калі ёсць сумненні ў крыніцы інфармацыі або размытая фармулёўка, верагоднасць двайнога тлумачэння і, адпаведна, розных адказаў. Каманда рэдактараў шмат разоў правярае і пераправярае пытанні, каб звесці працэнт памылак да мінімуму. Бо калі мы будзем дапускаць «ляпы» ў эфіры, то згубім крэдыт даверу гледачоў. Але нават пры дбайным падыходзе ў 3—4 туры часам бывае, што дзеці выдаюць нечаканыя адказы, якія могуць лічыцца правільнымі. Адмыслова для гэтага ў праекце задзейнічаны эксперт з Нацыянальнага інстытута адукацыі, які дапамагае вырашаць спрэчныя моманты. Так, на пытанне, чаму восенню лісце жаўцее, можна адказаць на розным узроўні, ад школьных урокаў біялогіі да глыбока навуковага тлумачэння з пункту гледжання хіміі. І хоць усе гэтыя варыянты будуць правільныя, але мы ўлічваем узровень школьнікаў, той мінімум ведаў, якія яны павінны мець у сваім узросце, — і калі бачым, што ход думкі правільны, заўжды становімся на бок вучня.

ВЫНІКІ З ПРАЦЯГАМ

— У цябе мала таго што настаўніцкія гены, але яшчэ і вялікі практычны вопыт работы з дзецьмі: выкладанне ў школе, больш за 10 гадоў важацтва ў дзіцячым летніку, удзел у адукацыйным праекце «Дзеці ў інтэрнэце». Сучасныя дарослыя часта ўпікаюць сваіх жа дзяцей за тое, што яны сядзяць у гаджэтах, мала чытаюць і г. д. На твой погляд чалавека «ў тэме», наколькі гэтыя папрокі блізкія да рэальнасці — цяперашнія дзеці моцна адрозніваюцца ад нас?

— Паўтаруся, што яны вельмі розныя. Менш чытаюць? Не сказаў бы. У мяне ёсць добры прыклад з летніка. Распытваў 13—15-гадовых падлеткаў, якія кнігі яны цяпер чытаюць, і нехта з дзяўчат выдаў: «Цяпер кніжкі чытаць не модна, а модна сядзець «УКантакце», — а іншыя абурыліся: «Што ты вярзеш!». Заўжды былі людзі, якія любяць чытаць, і тыя, хто не любіць. Галоўнае, каб чыталі і выбіралі найлепшае, вучыліся фільтраваць інфармацыю. У адрозненне ад часу, калі мы раслі, цяпер лішак інфармацыі з усіх бакоў, проста не паспяваеш за ўсім сачыць — пачынаючы з тупых постаў у Інстаграме, ад якіх трэба бараніцца, і завяршаючы нават вельмі сур'ёзнымі выданнямі, якія не грэбуюць метадамі таннай папулярнасці, каб зачапіць, зацягнуць да сябе чытачоў. Натуральна, многія не паспяваюць рэагаваць на бурлівую інфармацыйную плынь. І гэта відаць у тым ліку ў нашай гульні, асабліва ў трэцім туры — адзін удзельнік хутка націснуў кнопку і адказаў, а я бачу па вачах, што другі ці трэці таксама ведалі, але не паспелі... Неадназначная сітуацыя. Але, мабыць, у тым і адметнасць, непрадказальнасць праекта, што ёсць толькі тут і цяпер.

— Што лічыш галоўным вынікам праекта — не толькі ж раздачу дыпломаў і прызоў пераможцам?

— Мне падабаецца, што гульня стала альтэрнатывай існуючым інтэлектуальным шоу, дзе ўпор робіцца толькі на вялікі багаж ведаў. На мой погляд, дзеці мусяць заставацца дзецьмі, а не горбіцца пад грузам ведаў, нацэліўшыся на прэстыжную ВНУ. Калі праект толькі задумваўся, мы не хацелі зрабіць з яго цэнтралізаванае тэсціраванне па тэлебачанні, а арыентаваліся на гарманічнае развіццё асобы, уменне крытычна мысліць і выражаць свае думкі, камунікацыю чалавека з іншымі людзьмі — тыя навыкі, якія не раз спатрэбяцца ў дарослым жыцці. Спадзяюся, атрымалася данесці да ўдзельнікаў і гледачоў той пасыл, што важная як пэўная база ведаў, так і агульны кругагляд, наогул цікавасць да ўсяго, што адбываецца навокал. І пры тым даць зразумець: каб быць кемлівым і разумным чалавекам, не абавязкова быць занудай, а памыляцца не страшна, калі выносіш з гэтага карысны вопыт і вучышся чамусьці новаму. Асабіста маё меркаванне, што пры правільным падыходзе ў праграму можна ўкласці шмат сэнсаў...

— ...А для гэтага добра было б правесці другі набор вундэркіндаў. Гледачам і патэнцыйным удзельнікам чакаць новага сезона «Я ведаю!»?

— Шчыра кажучы, хацелася б. Па-першае, у нас раней такога не было, і вельмі прыемна, што з'явіўся ўласны інтэлектуальны праект для дзяцей — не калька з іншых ужо існуючых праграм, а цалкам зроблены беларусамі прадукт. Па-другое, усё гэта ёсць куды развіваць у сэнсе правілаў гульні, падбору пытанняў і г. д. — праект можа стаць яшчэ цікавейшым, гэта залежыць толькі ад нас.

P.S. Як пацвердзілі «Звяздзе» ў медыяхолдынгу, другому сезону віктарыны — быць. Так што, шаноўныя бацькі і настаўнікі вундэркіндаў, не ўпусціце момант і разам з дзецьмі рыхтуйцеся да наступных адбораў інтэлектуальнага шоу.

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.
Фота прадастаўлена Белтэлерадыёкампаніяй

ФІЛЬМЫ ПРА ЛЁСЫ

«ЗРОБЛЕНА Ў СССР»
МІР, 2 мая

На долю Івана Шышова выпала нямала: раскулачванне бацькоў і калектывізацыя, голад, вайна, на франтах якой ён цудам уратоўваўся з палаючага танка...

У мірны час Іван ажаніўся, вывеў у дарослае жыццё двух сыноў і дачку і застаўся з жонкай дажываць век у вёсцы. Але аднойчы яе вырашылі пусціць пад затапленне для будаўніцтва новай ГЭС, і бацькоў забрала ў горад дачка. Старэйшы сын Шышовых, які ваяваў у Анголе, быў цяжка паранены, атрымаў інваліднасць і смешную пенсію. Малодшаму ж сыну трэба зрабіць нялёгкі выбар паміж партыйнай кар'ерай і каханнем... Сям'ю Шышовых чакае поўны набор «прывабных бакоў» 70-х, і толькі гонар, годнасць і мужнасць дапамогуць ім прайсці праз усе нягоды.

«ПРЫСТОЙНАЯ СЯМ'Я ЗДАСЦЬ ПАКОЙ»
«РТР-Беларусь», 5 і 6 мая

Камедыйная меладрама пра лёс трох жанчын, Ганны Васілеўны, яе дачкі Надзі і ўнучкі Жэні, якія жывуць разам і ўжо змірыліся з адсутнасцю «другіх палавінак».

Зрэшты, калі старэйшая з жанчын памылкова знаходзіць у сябе смяротную хваробу, яна вырашае ўладкаваць дачку ў надзейныя мужчынскія рукі і знаходзіць «праверанага» жаніха — пляменніка сваёй добрай сяброўкі. А каб Надзя раней часу не разгадала матулін план і не пачала адштурхоўваць навязанае шчасце рукамі і нагамі, Ганна Васілеўна ідзе на хітрасць: прапануе здаць адзін з пакояў кватэры, нібыта для таго, каб сабраць грошы на рамонт. Але ініцыятыўная ўнучка вырашае паскорыць працэс і самастойна дае аб'яву пра тое, што здаецца пакой...

«ЯК МЫ ЖЫЛІ НА ВАЙНЕ»
«Беларусь 1», 5 і 6 мая

Мастацка-публіцыстычны праект Белтэлерадыёкампаніі, зроблены ў стылістыцы музычнага кіно 40—50-х гадоў мінулага стагоддзя, прысвечаны 73-й гадавіне Вялікай Перамогі і расказвае пра побыт фронту: работу цырульні, палявой кухні, лазні, пошты і г. д. Адмысловыя дэкарацыі для здымак былі ўзноўленыя на вялікім святлодыёдным экране, што дапамагло стварыць эфект прысутнасці і больш выразна перадаць атмасферу мінулай эпохі. 4-серыйны фільм з элементамі дакументальнай хронікі, успамінаў ветэранаў і тэатральных пастановак, па сутнасці, працягвае шматсерыйную стужку «Гумар на вайне», прадстаўленую на экранах два гады таму.

Панядзелак, 30 красавіка

Беларусь 1

7.15 Меладрама **«Усё яшчэ будзе» (12+).**
9.00, 12.00, 15.00 Навіны.
9.10 «Галоўны эфір».
— У апошнія гады акцэнт робіцца на развіцці вытворчых магутнасцяў і сацыяльных аб'ектаў — накшталт жывёлагадоўчых фермаў, аздараўленчых комплексаў. Летась газіфікавалі жыллёвы фонд вёсак Няраж і Холстава Быхаўскага раёна, зрабілі водаправодныя сеткі ў Быхаве і шэрагу іншых населеных пунктаў гэтага раёна. Вялікія грошы выдаткоўваліся на Магілёўскі анкадыспансер, будаўніцтва фізкультурна-аздараўленчых комплексаў у Краснаполлі, Касцюковічах і Быхаве.

> Сёння існуюць дзве крайнасці. Адны пакутуюць на радыяфобію, баяцца знаходзіцца ў забруджанай зоне нават пяць хвілін. А другія цалкам ігнаруюць правілы знаходжання і пражывання на такіх тэрыторыях.

Летась толькі на будаўніцтва было накіравана з рэспубліканскага бюджэту 23 мільёны рублёў. Сёлета вобласці выдзелена больш за 45 мільёнаў рублёў, на будаўніцтва з іх пойдзе 15,3 мільёна.

Дзе расце чыстая прадукцыя

Сёння на землях з узроўнем забруджанасці да 15 кюры вырошчваецца збожжа, іншыя раслінныя культуры, якія потым трапляюць да нас на стол у якасці гатовай прадукцыі.

— Наколькі гэта небяспечная ежа?

— Для папярэджання пападання радыенуклідаў праз каранёвую сістэму ў сельгаспрадукцыю існуе адрэгуляваны механізм дзеянняў, — канстатуе Сяргей Лазарэвіч. — Уносіцца павышаная доза калійных і фосфарных угнаенняў, адсочваецца кіслотны баланс глебы. Ствараюцца пашы для асабістых падсобных гаспадарак, дзе апошнія пяць гадоў рэгістраваліся пробы малака з перавышэннем дозы цэзію. Для гэтых гаспадарак набываюцца і камбікармы з цэзіязлучальнымі ферацынзмяшчальнымі элементамі.

Наогул, зонай рызыкоўнага па радыяцыйным фактары земляробства лічацца тэрыторыі з забруджанасцю звыш 15 кюры на кіламетр квадратны. Гэта землі абмежаванага землекарыстання. Іх, на шчасце, у нас не так шмат. Пры выкананні ўсіх патрабаванняў, якія прапісаны для вядзення там сельскай гаспадаркі, прадукцыя атрымліваецца нарматыўна чыстая. Гэтыя дапушчальныя нормы распрацавалі медыкі, але прадукцыя, як паказваюць даследаванні, атрымліваецца ў разы чысцейшая.

— З пункту гледжання звычайнага чалавека, дзяленне тэрыторый на чыстыя і брудныя вельмі ўмоўнае. Ну як можна зразумець той факт, калі з аднаго боку дарогі сеяць можна, а з другога — нельга?

— Сапраўды ёсць такі момант. Калі ішоў выкід ападкаў з радыеактыўнымі элементамі, у адных месцах выпала бруду больш, у другім менш. Таму і існуюць карты, дзе ўся гэтая стракатасць пазначана. Для сельгасугоддзяў яны нават больш падрабязныя. Кожны аграном мае карту забруджвання сваёй гаспадаркі па элементарных участках. Гэта калі кожнае поле абследуецца па спецметодыцы. Напрыклад, калі забруджанасць складае звыш 15 кюры, не рэкамендуецца вырошчваць зернебабовыя культуры: яны больш за астатнія накопліваюць «бруд». Адсочваецца, якія ўгнаенні трэба ўносіць, у якой колькасці. Што датычыцца малака, то за апошнія гадоў 10 няма нараканняў на яго чысціню. У прыватным сектары такое здараецца, таму што людзі не заўсёды бяруць да ведама рэкамендацыі сельвыканкама. Цікава, што апошняя проба з перавышэннем радыеактыўных рэчываў у малаку была выяўлена ў Бялыніцкім раёне. А вось у тым жа Слаўгарадскім на працягу пяці апошніх гадоў нічога такога няма. Знакаміты слаўгарадскі сыр, які робяць тамашнія майстры, лічыце, узор чысціні. Наогул, перапрацоўка малака ў сыр і тварог зніжае колькасць радыенуклідаў у разы.

Да ведама

На тэрыторыях з узроўнем забруджанасці ад 5 да 15 кюры, дзе радыеактыўны фон павышаны, асноўная дозавая нагрузка на арганізм атрымліваецца ўсё ж за кошт унутранага апраменьвання — інакш кажучы, таго, што мы ядзім. Можна не турбавацца за прадукты ў крамах, нават за сельскагаспадарчую прадукцыю, калі яна вырашчана непасрэдна на вашым участку. Галоўную небяспеку ўяўляе лес і ўсё, што знаходзіцца ў яго 5–7-сантыметровай падсцілцы — грыбы, ягады, расліны. І пра гэта абавязкова трэба помніць. А яшчэ пра пыл і попел. Пры згаранні драўніны ўтвараецца высокая канцэнтрацыя небяспечных элементаў, таму лепш не рабіць шашлыкі на мясцовых дровах.

А льготы каму?

Раней насельніцтва, якое пражывала на забруджаных тэрыторыях, атрымлівала даплаты, але потым падыходы змяняліся. У 2002 годзе ўступіў у дзеянне Дэкрэт Прэзідэнта № 16, згодна з якім сродкі, што раней часам ішлі ў кішэню асобна ўзятых людзей, сталі накіроўвацца на будаўніцтва сацыяльна-значных аб'ектаў — газа- і водаправодаў, набыццё лячэбна-дыягнастычнага абсталявання, тэхнічнае перааснашчэнне лячэбных устаноў і гэтак далей. Парадокс у тым, што сёння рэабілітацыя населеных пунктаў выклікае ў некаторых жыхароў... абурэнне — бо разам з ёю здымаюцца і льготы, якія існавалі на гэтых землях раней.

> Знакаміты слаўгарадскі сыр, які робяць тамашнія майстры, лічыце, узор чысціні. Наогул, перапрацоўка малака ў сыр і тварог зніжае колькасць радыенуклідаў у разы.

— Кожныя пяць гадоў праводзіцца шырокамаштабнае абследаванне тэрыторый на прадмет радыеактыўнага забруджвання, фонавай нагрузкі, шчыльнасці забруджвання глебы, колькасці радыенуклідаў у сельгаспрадукцыі і гэтак далей, — расказвае Сяргей Лазарэвіч. — На падставе такога шматфактарнага аналізу робяцца высновы. І атрымліваецца, што раз на пяць гадоў некаторыя населеныя пункты пераходзяць з зоны 5—15 кюры ў зону 1—5. Адпаведна, ільготы страчваюцца. Напрыклад, жанчынам, якія пражываюць на тэрыторыі з забруджваннем ад 5 да 15 кюры, выплачваецца дапамога па доглядзе дзіцяці да трох гадоў у памеры да 150 %, існуюць ільготы і для выпускнікоў школ, якія паступаюць у ВНУ, для ўсіх жыхароў гарантаваны 100-працэнтны бальнічны. Маладым спецыялістам, якія прыязджаюць працаваць у зону ад 5 і вышэй кюры, пры заключэнні кантракта на 5 гадоў выплачваецца 200 базавых велічынь, пры заключэнні другога 5-гадовага кантракта — 300.

Нэлі ЗІГУЛЯ.

Для страху няма падстаў

Сучасныя тэхналогіі дапамагаюць кругласутачна кантраляваць радыяцыйнае становішча ў нашай краіне і за мяжой.

Нягледзячы на чуткі пра перавышэнне радыяцыйнага фону, якія перыядычна ўзнікаюць у грамадстве, для страху няма падстаў, упэўнены **Арцём ІВАНОЎ, начальнік Рэспубліканскага цэнтра кіравання і рэагавання на надзвычайныя сітуацыі Міністэрства па надзвычайных сітуацыях.**

— Такія паведамленні паступаюць у Цэнтр і сапраўды пацвярджаюцца, — адзначыў Арцём Анатолевіч. — Але яны не звязаны з аварыйнымі сітуацыямі. Так, напрыклад, перавышэнні фіксаваліся на будаўнічай пляцоўцы, дзе выкарыстоўваўся граніт, а таксама на пункце перапрацоўкі другаснай сыравіны, куды трапіў радыеактыўны элемент, што прымяняецца ў медыцыне.

Па словах спецыяліста, сістэмы радыяцыйнага кантролю і маніторынгу навакольнага асяроддзя, якія сёння дзейнічаюць у краіне, дазваляюць у анлайн-рэжыме сачыць за сітуацыяй і пры неабходнасці аператыўна рэагаваць на падобныя інцыдэнты. Так, дзякуючы беларускім спадарожнікам у 2015 годзе атрымалася выявіць сур'ёзны пажар на ўкраінскай частцы Чарнобыльскай зоны. Беларускія ж спецыялісты дапамагалі яго тушыць.

Акрамя даных, што паступаюць з датчыкаў, размешчаных на тэрыторыі краіны, спецыялісты, згодна з міжнароднымі дамоўленасцямі, карыстаюцца інфармацыяй і з замежных пунктаў кантролю. Рэспубліканскі цэнтр з'яўляецца кантактным пунктам Арганізацыі Дагавора аб усёабдымнай забароне ядзерных выпрабаванняў. Тут маецца спецыяльнае абсталяванне, якое дае доступ да датчыкаў радыяцыйнага кантролю на ўсіх кантынентах.

— З дапамогай гэтай сістэмы мы выявілі перавышэнне доз рутэнію ў еўрапейскім паветры, а таксама вызначылі недакладнасць інфармацыі пра радыяцыйнае забруджванне ў выніку аварыі на АЭС у Францыі, — расказаў Арцём Іваноў.

Вераніка КОЛАСАВА.

ВЯРТАННЕ НА РАДЗІМУ

Аляксандр КАНАПЕЛЬКА.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

Плануе стварыць тут, у вёсцы Казялужжа, вялікую сям'ю і памочнік урача Глінішчанскай амбулаторыі, загадчык Хвоенскага ФАПа Міхаіл Аніскавец. У войску 24-гадовы хлопец адслужыў, запатрабаваную прафесію набыў у Слуцкім медыцынскім каледжы, цяпер у сваім доме заканчвае рамонт:

— У Хойніках ёсць дзяўчына, і мы плануем з ёй пажаніцца. Спачатку былі думкі пра розныя варыянты — застацца там, дзе вучыўся, ці ў сталіцу перабрацца. Але дома ўсё ж лепш. Тут усё роднае і ўсіх ведаеш. Тут спакойна і ўпэўнена сябе адчуваеш. Мне падабаецца аказваць людзям дапамогу. Ды і створаны ўсе ўмовы, каб плённа працаваць. Напрыклад, каб дабрацца да працоўнага месца, вядзяляецца транспарт.

Аляксандру Канапельку — 23. Год, як ён асвойваецца ў Нова-Барсукоўскім лясніцтве ў якасці памочніка ляснічага. Усмешлівы хлопец кажа, што сярод яго сваякоў леснікоў не было, а прафесію выбраў таму, што вельмі падабалася ў дзяцінстве з дзедам хадзіць у лес і на рыбалку. Ну і краявіды мясцовыя так падабаюцца, што пасля атрымання спецыяльнасці інжынера лясной гаспадаркі ў Гомельскім дзяржаўным універсітэце без разважанняў вярнуўся на радзіму працаваць:

— Калі пасядзець і разабрацца, нічога складанага ў рабоце няма. Нешта адразу атрымліваецца, нешта — не вельмі. Памылкі мне дапамагаюць выпраўляць калегі. Калектыў мяне добра прыняў — за год спрацаваліся і я шмат чаму навучыўся. Тут сябры і сваякі, таму заўсёды хацелася працаваць на радзіме.

24-гадовая **Вольга ЯРАЦ** зараз **выконвае абавязкі галоўнага агранома КСУП «Эксперыментальная база «Стралічава».** Дзяўчына спачатку закончыла Палескі аграрны каледж у Калінкавічах, а потым завочна і Беларускую сельскагаспадарчую акадэмію. Яе малая радзіма — вёска Веляцін за 17 кіламетраў ад Стралічава. З пачаткам пасяўной дадому не ездзіць, а так — штотыдзень выхадныя праводзіць з бацькамі:

— У верасні будзе пяць гадоў, як я тут. Прырасла ўжо. Выходзіш раніцай на поле — бачыш, як сонца ўстае. Назіраеш за станам прыроды, які змяняецца на тваіх вачах. Увесь час жыццё ідзе побач з прыродай. Мяне ніколі не цягнула ў мегаполісы. Толькі сюды, да бацькоў. Тут жывуць усе мае сваякі, многія аднакласнікі тут засталіся.

Працоўны дзень Вольгі пачынаецца ў 4.45. Гаворыць, паспявае і вочы нафарбаваць, і прычоску зрабіць. Мець пазногці з манікюрам праца агранома таксама не перашкаджае.

> Летась да нас па размеркаванні 130 чалавек прыехала, і толькі 40 пакінулі раён. Ураджэнцы ў абсалютнай большасці застаюцца і працуюць на сваёй зямлі.

— У нас жа мужчынскі калектыў, — гаворыць Вольга, якая пакуль не замужам. — Трэба ж быць прыгожай заўсёды. З шасці і да васьмі раніцы ў гаражы ацэньваем гатоўнасць тэхнікі. А ў восем тэхніка павінна быць на полі. Я еду часта з механізатарамі, каб паглядзець, як насенне загружаюць, як сеялка яго закрывае глебай. Цяпер садзім кукурузу. Ёю ў нашай гаспадарцы трэба засадзіць 2680 га ды яшчэ 1470 — яравымі культурамі. Работы сёлета стала больш, бо да нас далучылі яшчэ адну гаспадарку.

Гэта ўжо другая самастойная пасяўная Вольгі Ярац. Між тым першая была неблагой. Ураджайнасць у гаспадарцы склала 34 ц/га. Паказчык аказаўся найлепшым у раёне, за што дзяўчыну ўзнагародзілі на раённых «Дажынках» . У гэтым годзе, спадзяецца малады аграном, вынікі будуць палепшаны. Важныя складнікі працоўных дасягненняў — наладжаны быт і калектыў, дзе адно аднаму дапамагаюць.

— Мне нескладана кіраваць мужчынамі, многія з якіх па ўзросце падыходзяць у бацькі. Кіраўніцтва мне вельмі дапамагае ва ўсім. Да таго ж — службовае жыллё зусім побач з працай.

Вось такіх людзей — спецыялістаў сваёй справы — вельмі важна падтрымліваць публічна, лічыць **прэс-сакратар Гомельскага аблвыканкама Вольга РАБІКАВА.**

— Яны не пабаяліся звязаць свой лёс з невялікім горадам ці вёскай. Яны ўпэўнена працягваюць справу бацькоў на той зямлі, дзе нарадзіліся і выраслі. «Прыцягненне» — праект пра тых, хто любоў да краіны даказвае сваёй справай, — адзначае яна. — Праект ахопіць усе раёны Гомельскай вобласці. Па яго выніках больш за сотню ўдзельнікаў прымуць удзел у ток-шоу на мясцовым тэлебачанні, дзе ў фармаце дыялогу абмяркуюць шляхі развіцця рэгіёна.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

Міхаіл АНІСКАВЕЦ.

Вольга ЯРАЦ *(злева)*.

ОТЧЕТ ПРЕДПРИЯТИЯ (ОРГАНИЗАЦИИ)
ОАО «Слуцкий сахарорафинадный комбинат» за 2017 год
Учетный номер плательщика: **600075003**.
Вид экономической деятельности: **производство сахара**.
Организационно-правовая форма: **частная**
Орган управления: **концерн «Белгоспищепром»**.
Единица измерения: **тыс. руб.**
Адрес: **223610, г. Слуцк, ул. Головащенко, 6**

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС
на 31 декабря 2017 года

Активы	Код строки	На 31 декабря 2017 года	На 31 декабря 2016 года
1	2	3	4
I. ДОЛГОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ			
Основные средства (01 минус 02)	110	122997	118571
Нематериальные активы (04 минус 05)	120	659	509
Доходные вложения в материальные активы (03 минус 02)	130	205	249
Вложения в долгосрочные активы (08, 07)	140	11298	4062
Долгосрочные финансовые вложения (06)	150	17834	15380
Отложенные налоговые активы (09)	160	12	2
Долгосрочная дебиторская задолженность (60, 62, 76 минус 63)	170	610	797
Прочие долгосрочные активы (97)	180	368	94
ИТОГО по разделу I	**190**	**153983**	**139664**
II. КРАТКОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ			
Запасы	210	138299	82934
Расходы будущих периодов (97)	230	66	683
Налог на добавленную стоимость по приобретенным товарам, работам, услугам (18)	240	1033	435
Краткосрочная дебиторская задолженность	250	37167	31031
Краткосрочные финансовые вложения (58)	260	16115	38605
Денежные средства и их эквиваленты (50, 51, 52, 55, 57, 58)	270	16103	23009
Прочие краткосрочные активы (94)	280	1	1
ИТОГО по разделу II	**290**	**208784**	**176698**
БАЛАНС	**300**	**362767**	**316362**

Собственный капитал и обязательства	Код строки	На 31 декабря 2017 года	На 31 декабря 2016 года
1	2	3	4
III. СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ			
Уставный капитал (80)	410	66515	66515
Резервный капитал (82)	440	315	315
Добавочный капитал (83)	450	34338	34362
Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток) (84)	460	74650	71367
Чистая прибыль (убыток) отчетного периода (99)	470	-	-
Целевое финансирование (86)	480	-	-
ИТОГО по разделу III	**490**	**175818**	**172559**
IV. ДОЛГОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА			
Долгосрочные кредиты и займы (67)	510	1871	2650
Долгосрочные обязательства по лизинговым платежам (76)	520	229	
Отложенные налоговые обязательства (65)	530	11	11
Доходы будущих периодов (98)	540	-	-
Резервы предстоящих платежей (96)	550	-	-
Прочие долгосрочные обязательства	560	3886	5364
ИТОГО по разделу IV	**590**	**5997**	**8025**
V. КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА			
Краткосрочные кредиты и займы (66)	610	134400	40831
Краткосрочная часть долгосрочных обязательств	620	1110	29971
Краткосрочная кредиторская задолженность	630	45377	59962
Обязательства, предназначенные для реализации (76/7)	640	-	-
Доходы будущих периодов (98)	650	65	5014
Резервы предстоящих платежей (96)	660	-	-
Прочие краткосрочные обязательства	670	-	-
ИТОГО по разделу V	**690**	**180952**	**135778**
БАЛАНС	**700**	**362767**	**316362**

ОТЧЕТ
о прибылях и убытках за январь – декабрь 2017 года

Наименование показателей	Код строки	За январь – декабрь 2017 года	За январь – декабрь 2016 года
1	2	3	4
Выручка от реализации продукции, товаров, работ, услуг	010	228992	233949
Себестоимость реализованной продукции, товаров, работ, услуг	020	(202532)	(187763)
Валовая прибыль (010 – 020)	030	26460	46186
Управленческие расходы	040	(5713)	(4773)
Расходы на реализацию	050	(10350)	(8365)
Прибыль (убыток) от реализации продукции, товаров, работ, услуг (030 – 040 – 050)	060	10397	33048
Прочие доходы по текущей деятельности	070	67520	112157
Прочие расходы по текущей деятельности	080	(71775)	(115317)
Прибыль (убыток) от текущей деятельности (± 060 + 070 – 080)	090	6142	29888
Доходы по инвестиционной деятельности	100	51748	85181
Расходы по инвестиционной деятельности	110	(49507)	(76764)
Доходы по финансовой деятельности	120	20348	18825
Расходы по финансовой деятельности	130	(18401)	(31682)
Прибыль (убыток) от инвестиционной, финансовой и иной деятельности (100 – 110 + 120 – 130)	140	4188	(4440)
Прибыль (убыток) до налогообложения (± 090 ± 140)	150	10330	25448
Налог на прибыль (Д99К68)	160	(2378)	(4074)
Изменение отложенных налоговых активов (09)	170	9	-
Изменение отложенных налоговых обязательств (65)	180	-	-
Прочие налоги и сборы, исчисляемые из прибыли (дохода) (Д99К68)	190	-	-
Прочие платежи, исчисляемые из прибыли (дохода)	200	(423)	(546)
Чистая прибыль (убыток) (± 160 – 170 ± 180 ± 190 – 200-205-206)	210	7538	20828
Результат от переоценки долгосрочных активов, не включаемый в чистую прибыль (убыток)	220	-	9514
Результат от прочих операций, не включаемый в чистую прибыль (убыток)	230	-	-
Совокупная прибыль (убыток) (± 210 ± 220 ± 230)	240	7538	30342
Базовая прибыль (убыток) на акцию	250	15	41

Информация об открытом акционерном обществе и его деятельности по состоянию на 1 января 2018 г.

4. Доля государства в уставном фонде эмитента **51,00** (всего, в процентах), в том числе:

Вид собственности	Количество акций, шт.	Доля в уставном фонде, %
Республиканская	260960	51,00

5-6. Информация о дивидендах и акциях

Показатель	Единица измерения	За отчетный период	За аналогичный период прошлого года
Количество акционеров, всего	лиц	5848	5856
в том числе: юридических лиц	лиц	22	21
из них нерезидентов Республики Беларусь	лиц		
в том числе: физических лиц	лиц	5826	5835
из них нерезидентов Республики Беларусь	лиц	17	16
Начислено на выплату дивидендов в данном отчетном периоде	тысяч рублей	4279,20	2668,87
Фактически выплаченные дивиденды в данном отчетном периоде	тысяч рублей	4251,63	2646,03
Дивиденды, приходящиеся на одну простую (обыкновенную) акцию (включая налоги)	рублей	8,363448	7,941671
Дивиденды, приходящиеся на одну привилегированную акцию (включая налоги) первого типа ___	рублей		
Дивиденды, приходящиеся на одну привилегированную акцию (включая налоги) второго типа ___	рублей		
Дивиденды, фактически выплаченные на одну простую (обыкновенную) акцию (включая налоги)	рублей	8,309564	5,171512
Дивиденды, фактически выплаченные на одну привилегированную акцию (включая налоги) первого типа ___	рублей		
Дивиденды, фактически выплаченные на одну привилегированную акцию (включая налоги) второго типа ___	рублей		
Период, за который выплачивались дивиденды	месяц, квартал, год	2016 год	X
Дата (даты) принятия решений о выплате дивидендов	число, месяц, год	29.03.2017	X
Срок (сроки) выплаты дивидендов	число, месяц, год	26.04.2017 – государству, с 09.06.2017 по 30.06.2017 – остальным акционерам	X
Обеспеченность акции имуществом общества	рублей	343,63	337,27
Количество простых акций, находящихся на балансе общества	штук		

8. Среднесписочная численность работающих (человек): **730,** прошлый год **– 727.**

9. Основные виды продукции или виды деятельности, по которым получено двадцать и более процентов выручки от реализации товаров, продукции, работ, услуг: **сахар – 76,8 %.**

10. Дата проведения годового общего собрания акционеров, на котором утверждался годовой бухгалтерский баланс за отчетный год: **29 марта 2018 года.**

13. Сведения о применении эмитентом свода правил корпоративного поведения: **при выдвижении кандидатур в Наблюдательный совет и ревизионную комиссию, при разработке внутренних документов Общества.**

14. Адрес официального сайта открытого акционерного общества в глобальной компьютерной сети Интернет: **sugar.by.**

По мнению аудиторской организации ООО «КПМГ», бухгалтерская отчетность ОАО «Слуцкий сахарорафинадный комбинат» достоверно во всех существенных аспектах отражает финансовое положение ОАО «Слуцкий сахарорафинадный комбинат» на 31 декабря 2017 года, а также финансовые результаты деятельности и изменения финансового положения ОАО «Слуцкий сахарорафинадный комбинат» за год, закончившийся на указанную дату, в соответствии с требованиями законодательства Республики Беларусь.

Руководитель Н. П. Прудник

Главный бухгалтер С. А. Касабуцкая

ГЭТА МЫ

СВАЯКАМ НЕ ПАТРЭБНЫЯ?

ЖЫЛІ ў Мінску маці з сынам. Жанчына памерла. Сын пазваніў у службу перавозак сталічнага спецкамбіната, каб яе забралі. Прыехалі спецыялісты, адвезлі маці ў крэматорый і папярэдзілі сына, што яму трэба набыць труну і аформіць дакументы на крэмацыю і пахаванне. Прайшло тры дні, а сын так і не з'явіўся. Пазванілі яму з крэматорыя, пытаюць, дзе ён дзеўся, а той ім сустрэчнае пытанне: «А хіба вы яе яшчэ не крэміравалі?».

Сын палічыў, што калі маці забраў спецкамбінат, то яго работнікі павінны самі ўсё зрабіць. Грошы ж, што дзяржава выдаткавала на пахаванне, ён даўно прапіў... Аднак маці, напэўна, прадбачыла, як можа павярнуцца справа, таму грошы з пенсіі збірала ды пад матрац хавала. Добра, што сын іх адразу не знайшоў, а толькі тады, калі зноў прыехалі супрацоўнікі спецкамбіната. За тыя матчыны сродкі ён і труну набыў, і рытуальныя прыналежнасці, і дакументы аформіў. Маці крэміравалі, а урна з яе прахам... так і стаіць другі год у крэматорыі, бо сыну яна не патрэбна. Забраць яе і пахаваць па-людску яго ўжо ніякім законам не прымусіш, колькі ні звані. А як пройдуць тры гады, урну пахаваюць у агульнай магіле разам з іншымі крэміраванымі, якія не патрэбны сваякам.

Забралі і... забыліся

Летась спецыялізаваны камбінат камунальна-бытавога абслугоўвання такім чынам пахаваў на Заходніх могілках 62 урны з прахам тых, каго сваякі пагадзіліся крэміраваць, але за тры гады так і не забралі з крэматорыя. Цяпер над агульнай магілай змяшчаецца таблічка, дзе сказана, што тут захаваны незапатрабаваныя урны і ўказана іх колькасць без пераліку імёнаў. Спіс тых, хто менавіта захаваны, застаецца ў арганізацыі.

Не забіраюць урны з прахам з розных прычын. У кагосьці сваякі алкаголікі, або яны не маюць магчымасцяў і сродкаў на пахаванне, або пераехалі за мяжу. А ёсць і такія, хто жылі як кот з сабакам, і для іх галоўнае, што сваяка крэміравалі, а далей — хоць трава не расці.

— Летась перад пахаваннем урнаў, якія захоўваліся ў нас ужо тры гады, мы на сайце вывесілі абвестку, што збіраемся рабіць, і абзвоньвалі сваякоў, чые каардынаты мелі, каб папярэдзіць, — заўважае **Сяргей ТУР, намеснік дырэктара спецыялізаванага камбіната камунальна-бытавога абслугоўвання.** — З 67 урнаў толькі пяцёра забралі сваіх. Астатнія адправіліся на спачын у агульную магілу.

Рашэнне аб крэмацыі прымаюць сваякі памерлага або арганізацыя, якая бярэ на сябе абавязкі па пахаванні, калі ў нябожчыка нікога не было. Здараецца, сам чалавек пакідае распараджэнне пра такое сваё жаданне. Урну з прахам можна пахаваць у зямлю на магіле ці паставіць у калумбарную сценку. Крэмацыя, дарэчы, абыходзіцца крыху танней, чым традыцыйнае пахаванне.

— Сваякі атрымліваюць на пахаванне каля 800 рублёў. Калі набываць самыя танныя прыналежнасці да пахавання, з гэтых грошай застаецца каля 300 рублёў. Так звычайна робяць тыя, хто любіць выпіць: самае таннае купяць, сваяка крэміруюць, а рэшту прап'юць. А пра урну потым не хочуць нічога ведаць, ім ужо памерлы не патрэбны, — заўважае спецыяліст.

Безыменныя...

Амаль на кожных могілках ёсць участкі, дзе ляжаць тыя, хто пры жыцці не меў ні жылля, ні родных. На іх пагостах драўляныя тумбы ўстаноўленага ўзору або металічныя крыжы з нумарамі. Здараецца, сустракаецца і імя, калі супрацоўнікам спецкамбіната ўдалося яго даведацца. Гэтыя людзі сталі незапатрабаванымі пасля смерці, і іх пахавалі за кошт дзяржавы на агульных могілках.

Нейкага тэрміну для захоўвання безыменных памерлых не існуе. Калі ў моргу збіраецца некалькі такіх асоб, іх перадаюць у спецкамбінат.

— Апошнія тры-чатыры гады такім памерлым перад пахаваннем абавязкова робяць аналіз ДНК, каб, калі знойдуцца сваякі, не ўзнікала блытаніны. Здараецца, што родныя пахаванага з'яўляюцца і праз тры месяцы, і праз паўгода ці год, — кажа Сяргей Тур.

Менавіта таму, што сваякі ў многіх праз час усё ж знаходзяцца, асоб без пэўнага месца жыхарства не крэміруюць, — каб родныя маглі добраўпарадкаваць магілу. Некаторыя нават просяць аб эксгумацыі, каб перавезці цела на іншыя могілкі, бліжэй да продкаў. Аднак з агульнай магілы ні урны, ні трупы не эксгумуюцца.

Супрацоўнікі спецкамбіната спадзяюцца з часам атрымаць дазвол на крэмацыю такіх асоб. Для захавання урны з прахам трэба ўсё ж не так шмат месца, а зямлі для пахаванняў застаецца ўсё менш.

Ірына СІДАРОК.

ПЫТАЛЬНІК

ПАЛЯЎНІЧЫ Ў ЛОДЦЫ

Ці магчыма такое падчас нераста?

Былі ў сваякоў ва Ушацкім раёне. Сустрэлі знаёмага, той паляўнічы. Ён сказаў, што збіраецца на птушку, для палявання рыхтуе лодку. Але ж зараз дзейнічае веснавая забарона на лоўлю рыбы, падчас якой лодкамі карыстацца забаронена. Ці не так?

Ігар ПАЛЯНСКІ, *г. Мінск.*

Сапраўды, у перыяд нераставай забароны рыбакам і іншым грамадзянам забаронена выкарыстоўваць у рыбалоўных угоддзях маламерныя судны. Аднак для паляўнічых у веснавым сезоне зроблены выключэнні. Як нагадалі ў Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, паляўнічыя могуць карыстацца маламернымі суднамі без рухавікоў, толькі для пэўных мэт: устаноўкі і (або) зняцця падсадных качак, профіляў, чучал і пад'ёму здабытай дзічыны. Гэтая норма замацавана як у Правілах вядзення рыбалоўнай гаспадаркі і рыбалоўства (падпункт 109.6), так і ў Правілах вядзення паляўнічай гаспадаркі і палявання (пункт 115).

Выкарыстанне паляўнічымі маламерных суднаў у іншых мэтах — для транспарціроўкі да месца палявання або назад, пераправы цераз водныя аб'екты, у якасці скрадка (шляхам абсталявання апошняга непасрэдна на маламерным судне), для дабору падранкаў і іншае — у веснавым сезоне палявання не дапускаецца! Гэта з'яўляецца адміністрацыйным правапарушэннем, за якое прадугледжана адказнасць.

Знаходжанне ў маламерным судне паляўнічых з расчахлёнай і (або) зараджанай паляўнічай зброяй з'яўляецца паляваннем з пад'езду, ажыццяўленне якога ў веснавым сезоне палявання забаронена.

Сяргей РАСОЛЬКА.

«Годовой отчет эмитента ценных бумаг»
Полн. наименование: открытое акционерное общество «МАПИД»
Адрес: 220036, г. Минск, ул. Р. Люксембург, 205
Полное Ф.И.О. руководителя: Милошевский Николай Викторович
Полное Ф.И.О. главного бухгалтера: Цыбульская Елена Владимировна
Основные виды деятельности: строительство
Единица измерения: тыс. руб.

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 31 декабря 2017 года

АКТИВ	Код строки	На конец отчетного периода
I. Долгосрочные активы		
Основные средства	110	101 276
Нематериальные активы	120	278
Доходные вложения в материальные активы	130	-
Вложения в долгосрочные активы	140	15 488
Долгосрочные финансовые вложения	150	666
Отложенные налоговые активы	160	6
Долгосрочная дебиторская задолженность	170	540
Прочие долгосрочные активы	180	-
ИТОГО по разделу I	**190**	**118 254**
II. Краткосрочные активы		
Запасы	210	51 070
Долгосрочные активы, предназначенные для реализации	220	-
Расходы будущих периодов	230	1 178
Налог на добавленную стоимость по приобретенным товарам, работам, услугам	240	575
Краткосрочная дебиторская задолженность	250	59 693
Краткосрочные финансовые вложения	260	-
Денежные средства и их эквиваленты	270	7 857
Прочие краткосрочные активы	280	242
ИТОГО по разделу II	**290**	**120 615**
БАЛАНС	**300**	**238 869**
Собственный капитал и обязательства		
III. Собственный капитал		
Уставный капитал	410	68 462
Неоплаченная часть уставного капитала	420	-
Собственные акции(доли в уставном капитале)	430	-
Резервный капитал	440	6 190
Добавочный капитал	450	45 036
Нераспределенная прибыль(непокрытый убыток)	460	55 151
Чистая прибыль(убыток)отчетного периода	470	-
Целевое финансирование	480	-
ИТОГО по разделу III	**490**	**174 839**
IV. Долгосрочные обязательства		
Долгосрочные кредиты и займы	510	1 023
Долгосрочные обязательства по лизинговым платежам	520	16
Отложенные налоговые обязательства	530	-
Доходы будущих периодов	540	6 694
Резервы предстоящих платежей	550	-
Прочие долгосрочные обязательства	560	-
ИТОГО по разделу IV	**590**	**7 733**
V. Краткосрочные обязательства		
Краткосрочные кредиты и займы	610	5 167
Краткосрочная часть долгосрочных обязательств	620	460
Краткосрочная кредиторская задолженность	630	46 619
Обязательства,предназначенные для реализации	640	-
Доходы будущих периодов	650	3 752
Резервы предстоящих платежей	660	298
Прочие краткосрочные обязательства	670	1
ИТОГО по разделу V	**690**	**56 297**
БАЛАНС	**700**	**238 869**

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ
с 1 января 2017 г. по 31 декабря 2017 г.

Наименование показателей	Код строки	За отчетный период
Выручка от реализации продукции, товаров, работ, услуг	010	290 725
Себестоимость реализованной продукции, товаров, работ, услуг	020	248 081
Валовая прибыль	**030**	**42 644**
Управленческие расходы	040	7 134
Расходы на реализацию	050	842
Прибыль(убыток) от реализации продукции, товаров, работ, услуг	**060**	**34 668**
Прочие доходы по текущей деятельности	070	13 766
Прочие расходы по текущей деятельности	080	23 873
Прибыль по текущей деятельности	090	24 561
Доходы по инвестиционной деятельности	100	5 079
Расходы по инвестиционной деятельности	110	5 963
Доходы по финансовой деятельности	120	505
Расходы по финансовой деятельности	130	818
Прибыль(убыток) от инвестиционной, финансовой и иной деятельности	**140**	**-1 197**
Прибыль до налогообложения	150	23 364
Налог на прибыль	160	6 141
Изменение отложенных налоговых активов	170	-
Изменение отложенных налоговых обязательств	180	-
Прочие налоги и сборы, исчисляемые из прибыли	190	-
Прочие платежи, исчисляемые из прибыли	200	20
Чистая прибыль	**210**	**17 203**
Количество акционеров, всего	чел.	7 119
в том числе: юридических лиц	чел.	5
из них нерезидентов Республики Беларусь	чел.	нет
в том числе: физических лиц	чел.	7 124
из них нерезидентов Республики Беларусь	чел.	нет
Доля государства в уставном фонде (коммунальная)	%	93,3572
Начислено на выплату дивидендов за отчетный период	тыс. руб.	5 238,19
Дивиденды, приходящиеся на одну акцию (включая налоги)	руб.	0,4743
Обеспеченность акций имуществом Общества	руб	15,83
Количество простых акций, находящихся на балансе Общества	штук	нет
Среднесписочная численность работающих	чел.	5 882
Дата проведения годового общего собрания акционеров, на котором утверждался годовой бухгалтерский баланс за отчетный год	29 марта 2018 года	
Основные виды продукции или виды деятельности, по которым получено двадцать и более процентов выручки от реализации товаров, продукции, работ, услуг	общее строительство зданий	
Сведения о применении эмитентом правил корпоративного поведения	применяется	

Генеральный директор ОАО «МАПИД» Н. В. Милошевский

Главный бухгалтер ОАО «МАПИД» Е. В. Цыбульская

Аудиторское мнение ООО «Белросаудит»

По нашему мнению, прилагаемая бухгалтерская (финансовая) отчетность достоверно во всех существенных аспектах отражает финансовое положение ОАО «МАПИД» на 31.12.2017 г., а также финансовые результаты его деятельности и изменение его финансового положения, в том числе движение денежных средств, за год, закончившийся на эту дату, в соответствии с законодательством Республики Беларусь.

Уважаемые акционеры!

Общим собранием акционеров ОАО «МАПИД» от 29 марта 2018 года установлен следующий порядок и сроки выплаты дивидендов:

– на долю собственности г. Минска – путем перечисления на расчетный счет финотдела администрации Фрунзенского района;

– работникам юридическим лицам – путем перечисления на расчетные счета – с 01.06.2018 до 30.06.2018;

– физическим лицам, не работникам Общества – путем перечисления через депозитарий «Лидеринвест» с последующей выплатой; по заявлению акционера – почтовым переводом – с 01.06.2018 до 30.06.2018.

– физическим лицам, не работникам Общества,имеющим право на стандартные вычеты по подоходному налогу – по заявлению акционера путем перечисления на электронные карточки.

установленный размер дивидендов на одну акцию за II полугодие 2017 года составляет – 0,2563 рубля.

Депозитарий ЗАО «Лидеринвест» располагается по адресу: г. Минск, ул. Я. Мавра, д. 41, оф. 512. При обращении в депозитарий, при себе иметь документ, удостоверяющий личность.

Администрация.

УНП 100008115

БУДЗЬ У КУРСЕ!

НЕРАЎНАДУШНЫЯ — ЗА «ЧЫСТЫ ВАДАЁМ»

Акцыя пад такой назвай пройдзе ў краіне з 27 красавіка па 4 мая. Яе з 2014 года традыцыйна праводзіць рэспубліканскае дзяржаўна-грамадскае аб'яднанне «Беларускае таварыства паляўнічых і рыбаловаў». Далучыцца да мерапрыемства могуць усе ахвотныя.

За гэты час сіламі супрацоўнікаў БТПР разам з прадстаўнікамі іншых арганізацый, а таксама нераўнадушных грамадзян прыведзена ў парадак больш за тры тысячы кіламетраў берагавой лініі вадаёмаў і вадацёкаў краіны. У акцыі бралі ўдзел звыш 25 тысяч чалавек, было сабрана каля чатырох тысяч кубаметраў смецця, якое вывезена на палігоны цвёрдых бытавых адходаў.

Акцыя ў першую чаргу скіраваная на экалагічнае выхаванне ўсіх слаёў насельніцтва, прыцягненне ўвагі да праблемы забруджвання вадаёмаў, а таксама на прывядзенне ў парадак прыбярэжнай зоны вадаёмаў і вадацёкаў напярэдадні масавага актыўнага адпачынку на прыродзе.

Сяргей РАСОЛЬКА.

15 тысяч дрэў за некалькі гадзін

Лес «Юнацтва» з'явіўся 19 красавіка ў Рэчыцкім раёне. Цімураўцы Беларускай рэспубліканскай піянерскай арганізацыі, валанцёры руху «Добрае сэрца» і ўдзельнікі студатрадаўскага руху Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі каля вёскі Аляксандраўка за некалькі гадзін высадзілі 15 тысяч дрэў.

Маладыя людзі будуць сачыць і за тым, як набіраюць сілу высаджаныя імі на плошчы 3 га хвоі і бярозы. Пасадачны матэрыял для дзяцей выдзеліў Рэчыцкі лясгас. Дасведчаныя лесаводы расказалі ім пра прыродны патэнцыял беларускіх лясоў і барацьбу з караедам, якая праводзіцца на Гомельшчыне. Акцыя стала адным з мерапрыемстваў, прымеркаваных да рэспубліканскага Тыдня лесу. Акрамя таго, моладзь рэгіёна прымае актыўны ўдзел у навядзенні парадку на зямлі — каля вадаёмаў, на вуліцах, у дварах, скверах і парках населеных пунктаў.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

ЗДАРЭННІ

ГОРА ДЛЯ ЎСЁЙ ВЁСКІ

Як паведамілі ў абласным упраўленні МНС, у адну з начэй у вёсцы Камень Пінскага раёна ў агні загінулі муж і жонка.

Карэспандэнт газеты звязалася са **старшынёй Загародскага сельскага Савета Аленай БАГАТКАЙ.** Алена Іванаўна расказала, што ранкам каля хаты плакала ўся вёска. Раіса і Васіль Завадскія былі ў ліку самых аўтарытэтных людзей Каменя. Раіса Аляксандраўна ва ўзросце 67 гадоў яшчэ працавала сацыяльным работнікам, дапамагала старым, адзінокім людзям. Яна была сапраўднай маці Тэрэзай для вёскі, бо заўсёды дапамагала і тым, хто не знаходзіўся ў яе на абслугоўванні. Усе ўжо прывыклі, што Раіса Аляксандраўна магла зайсці да нямоглага, прынесці яму свежага супчыку, прыбраць злёгку, забраць дадому бялізну, каб памыць. Яе любілі і за тое, што за жыццё ні з кім не пасварылася, нікога не асудзіла, толькі добрую параду магла даць, добрым словам суцешыць.

Суседзі ведаюць, што напярэдадні ў гаспадароў былі праблемы з электрычнасцю і яны выклікалі спецыялістаў. Потым паведамілі дзецям, што ўсё адрамантавана. Чацвёра дзяцей Завадскіх жывуць у Брэсце і Пінску. Ім зараз спачувае ўся вёска.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

МЯСЦОВЫ ЧАС

ГАРАЖЫ-МІРАЖЫ

Нядаўна знаёмы падзяліўся праблемай: — Купіў аўтамабіль, а гаража няма. А тут падвярнуўся выпадак — сусед-пенсіянер прадае свой гараж, што за бальніцай. Цана мяне задавальняе, але ёсць адна закавыка: ніякіх дакументаў на пабудову няма. Што рабіць? Ці не адбяруць пасля ў мяне той гараж?

Правёўшы невялікае журналісцкае расследаванне, ужо праз некалькі дзён пераканаўся: на Уздзеншчыне афіцыйных дакументаў на права валодання гаражамі не маюць каля дзвюх соцень іх уладальнікаў, у гаражных масівах, што ў раёне бальніцы і магазіна «Еўраопт».

Легкавы аўтамабіль перастаў быць раскошай і стаў незаменным атрыбутам. Зніклі чэргі на яго набыццё, айчынны рынак напоўнілі прадстаўнікі не толькі расійскага аўтапрама, але і шэрагу іншых, еўрапейскіх і азіяцкіх, краін. Вось і Узду запаланілі аўто прасцейшых і больш прэстыжных марак. Хто меў свой прысядзібны ўчастак, ставіў машыну ў надворнай пабудове. Жыхары ж шматкватэрных дамоў — каля пад'ездаў. Потым гарадскія ўлады выдзелілі для будаўніцтва індывідуальных гаражоў невялікі ўчастак на тагачаснай ускраіне райцэнтра, недалёка ад цяперашняга «Еўраопта». Гэтую пляцоўку, дзе размясціліся 90 гаражоў, за некалькі гадоў запоўнілі-забудавалі.

У канцы 1980-х рашэннем мясцовай улады выдзяляецца новы ўчастак для гаражоў, паблізу Водаканала. Гэтым разам пад іх адвялі большую плошчу, бо ахвотных атрымаць дах для сваіх чатырохколавых памочнікаў было шмат. Афіцыйных дакументаў аб утварэнні гаражнага кааператыва адшукаць не ўдалося, але фактам застаецца тое, што ён існаваў. На той час, пэўна, не патрабавалася такой колькасці прававых актаў і юрыдычных фармальнасцяў.

На працягу некалькіх гадоў рэгістрацыяй новых уладальнікаў машын і ахвотных мець гараж, зборам узносаў, выдзяленнем пустуючых участкаў займаліся тагачасныя старшыня райкама прафсаюза работнікаў сельскай гаспадаркі і кіраўнік землеўпарадкавальнай службы. Час ад часу ўладальнікі гаражоў скідваліся па тры—сем рублёў для выканання пэўных гаспадарчых работ: расчысткі пад'езду да гаражоў ад снегу, грэйдзіравання дарогі, санітарнай уборкі тэрыторыі. Ладзілі і суботнікі. Меліся планы сабраць грошы і ўладкаваць электрычнае асвятленне, але калі падлічылі магчымыя агульныя затраты, то ад задумы адмовіліся.

Ішоў час. Паступова ўдасканальвалася прававая база ў многіх сферах жыцця. Высветлілася, што многія ўладальнікі названых вышэй гаражоў у райцэнтры, а таксама ў аграгарадку Хатляны і ў некаторых іншых населеных пунктах Уздзеншчыны не маюць на руках афіцыйных дакументаў на права валодання нерухомай маёмасцю.

Юрысты сведчаць: нельга лічыць дакументамі выдадзеныя ў 80—90-я гады мінулага стагоддзя не існуючым сёння пасялковым Саветам дэпутатаў выпіскі з рашэння выканкама аб выдзяленні зямельнага ўчастка.

— Часткай 2 артыкула 7 Грамадзянскага кодэкса Рэспублікі Беларусь устаноўлена непахіснае правіла ў адносінах да любой нерухомай маёмасці, — тлумачыць **загадчык Уздзенскага бюро Дзяржынскага філіяла РУП «Мінскае абласное агенцтва па дзяржаўнай рэгістрацыі і зямельным кадастры» Максім ШОБІК.** — Права на маёмасць узнікае толькі з моманту рэгістрацыі гэтай маёмасці ці адпаведных правоў на яе. На жаль, нягледзячы на тое, што ў горадзе Узда і раёне існуе нямала такіх гаражоў, юрыдычныя правы на іх людзі законным чынам так і не зарэгістравалі.

Якія адсюль вывады? Такія гаражы нельга падарыць, перадаць у спадчыну, прадаць. Так, некаторыя негалосна перадаюцца ў карыстанне ад бацькі сыну, суседу, знаёмаму, нават прадаюцца — «пад распіску» за пэўную суму, але калі новы ўладальнік паспрабуе зарэгістраваць такі гараж, здзелка не будзе лічыцца законнай.

Якое выйсце з сітуацыі?

— Уладальнікі гаражоў павінны стварыць і афіцыйна зарэгістраваць юрыдычную асобу — гаражны кааператыў, — падказвае алгарытм дзеянняў Максім Шобік. — Абраны на агульным сходзе старшыня кааператыва звяртаецца ў райвыканкам для выдзялення зямельнага ўчастка пад ўвесь гаражны масіў. Пасля рэгістрацыі ўчастка спецыялісты нашага бюро ці іншай арганізацыі, якая мае адпаведную ліцэнзію на выкананне такіх работ, правядуць тэхнічную інвентарызацыю масіву і кожнага з гаражоў, у які будзе забяспечаны доступ. І толькі пасля гэтага ўладальнікі гаражоў могуць звяртацца да нас ці ў іншую ўстанову для афармлення тэхнічнага пашпарта, які і будзе законным дакументам на права валодання пабудовай.

Падобную работу не раз спрабавалі арганізаваць, але да лагічнага завяршэння так і не дайшло. У 2000 годзе ва Уздзенскім райвыканкаме быў зарэгістраваны гаражны кааператыў «Сваё аўто», яго кіраўніком абралі Сяргея Салаўёва. Кааператыў стаў юрыдычнай асобай, адкрылі яго разліковы рахунак у Беларусбанку. На працягу некалькіх гадоў неаднаразова праводзіліся агульныя сходы, дзе членам кааператыва, новым ахвотным займець дах над сваім аўтамабілем тлумачылі іх правы і абавязкі.

Але нярэдка на такія сходы са 176 маючых гаражы прыходзілі ўсяго па 30—40 чалавек. (На чаргу маючых патрэбу ў гаражах пастаўлена яшчэ каля 100 ахвотных.) Некаторыя са «старажылаў» адмаўляюцца прыходзіць на сходы з той прычыны, што лічаць законным дакументам старую выпіску з пасяджэння пассавета аб выдзяленні ўчастка. Паводзінамі некаторых кіруюць уласныя амбіцыі. А многіх задавальняе існуючая сітуацыя: гараж ёсць, прадаваць ці дарыць яго мы не збіраемся...

Кааператыў «Сваё аўто» ў свой час звяртаўся ў землеўпарадкавальную службу райвыканкама. Аднак справу гэтую да канца не давялі, участак так і не зарэгістравалі.

Потым на працягу некалькіх гадоў работай гаражнага кааператыва займаліся спецыялісты юрыдычнай, землеўпарадкавальнай службаў райвыканкама. Усё цяжэй было сабраць людзей на сход, а тым больш — для ўнясення чарговага ўзносу для выканання той ці іншай работы.

Сёння неабходна зноў арганізаваць работу па афармленні і рэгістрацыі землеўпарадкавальнай справы. А для гэтага павінны прыйсці ў райвыканкам тыя члены кааператыва, якія нібыта маюць нейкія дакументы на гараж, напісаць заяву аб фармальнай адмове ад яго і афармленні новых дакументаў. Без сустрэчы з кожным уладальнікам гаража цяжка давесці справу да канца...

Віктар САБАЛЕЎСКІ.

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.
Адказны за выпуск: КАРПЕНКА Н.У.

Грамадскі савет: **ПАПКОЎ А.А.,** старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні; **ЦУПРЫК Л.А.,** старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце; **ПАПКО В.М.,** намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па міжнародных справах; **БЕЛЯКОЎ А.Э.,** намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці; **ПАНАСЮК В.В.,** старшыня Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў; **ДРЫЛЁНАК Т.Л.,** старшыня Лёзненскага раённага Савета дэпутатаў; **СУШЧАНКА М.Л.,** старшыня Глушанскага пасялковага Савета дэпутатаў Бабруйскага раёна.

Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН 292 44 12;
e-mail: info@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.

Тыраж 20.008. **Нумар падпісаны ў 19.30 26 красавіка 2018 года.**